Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра гісторыі Беларусі

**М.В. Півавар**

# ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА

***Метадычныя рэкамендацыі***

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2016*

УДК 338.48:913(476.5)(075.8)
ББК 65.433(4Беи-4Вит)я73
П32

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 2 ад 24.12.2015 г.

Аўтар: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт **М.В. Півавар**

Р э ц э н з е н т ы :
галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама,
кандыдат гістарычных навук *Д.В. Юрчак*;
загадчык кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.М. Дулаў*

**Півавар, М.В.**
**П32** Турыстычнае рэгіёназнаўства : метадычныя рэкамендацыі / М.В. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016. – 56 с.

Метадычныя парады па курсу "Турыстычнае рэгіёназнаўства" будуць карысныя для студэнтаў універсітэта, краязнаўцаў, экскурсаводаў, выкладчыкаў і настаўнікаў, якія займаюцца вырашэннем пытанняў развіцця ўнутранага турызму.

Змешчаны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў і помнікаў прыроды Віцебскай вобласці ўтрымлівае некалькі сотняў аб'ектаў, якія могуць выкарыстоўвацца ва ўнутраным турызме. Шэраг з іх выяўлены ў выніку пошукавай працы і ўпершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

**УДК 338.48:913(476.5)(075.8)**
**ББК 65.433(4Беи-4Вит)я73**

© Півавар М.В., 2016
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

Уводзіны …………………………………………………………….. 4

Праграма курса “Турыстычнае рэгіёназнаўства” …………………… 6

Семінарскія заняткі па курсу “Турыстычнае рэгіёназнаўства” ……. 8

Прыкладныя тэсты па курсу “Турыстычнае рэгіёназнаўства” …...… 15

Прыкладныя тэмы рэфератаў на курсу “Турыстычнае рэгіёназнаўства” ……………………………………………………….. 20

Прыкладны пералік пытанняў да экзамену “Турыстычнае рэгіёназнаўства” ……………………………………………………… 22

Спіс літаратуры па курсу …………………………………………... 24

Спіс гісторыка-культурных і прыродных турыстычных аб’ектаў Віцебскай вобласці ………………………………..…………….... 25

Репозиторий ВГУ

# УВОДЗІНЫ

Дысцыпліна “Турыстычнае рэгіёназнаўства” прызначана для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)”.

**Мэта** выкладання дысцыпліны: забяспечыць дастатковы ўзровень тэарэтычных ведаў і навыкаў іх выкарыстання ў рашэнні практычных праграм развіцця ўнутранага турызму ў Рэспубліцы Беларусь і ў Віцебскай вобласці ў прыватнасці; спрыяць фарміраванню патрыятызму і грамадзянскіх якасцяў навучэнцаў.

**Задачы курса:**

- сфарміраваць веды пра гісторыка-культурныя рэгіёны краіны, найбольш адметныя помнікі гісторыі, культуры і прыроды Беларускага Паазер’я, наваколлі Віцебска, г. Віцебск;
- навучыць методыцы выяўлення, зберажэння, прэзентацыі і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны;
- развіваць уменні пошуку інфармацыі і працы з ёй;
- сфарміраваць уяўленне ў студэнтаў аб значнасці ведаў пра свой край, рэгіёны краіны, Еўропы;
- развіваць уменні самастойнай працы з рэгіёназнаўчай інфармацыяй;
- выхоўваць імкненне да самаадукацыі і самавыхавання;
- падрыхтаваць спецыялістаў да самастойнай работы.

Студэнты, засвоіўшы курс павінны:

***ведаць:***

- турыстычныя рэсурсы рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь, важнейшыя помнікі гісторыі, культуры і прыроды;
- асаблівасці і праблемы менеджмэнта рэгіянальнага турызму;
- месца і ролю музеяў у культурным жыцці асобных рэгіёнаў;
- асноўныя этапы гісторыі асобных рэгіёнаў, факты, даты, падзеі, імёны і хактарыстыкі гістарычных дзеячаў;
- агульныя заканамернасці працэса станаўлення і развіцця мастацтва таго ці іншага рэгіёна, механізм уплыву мастацтва суседніх рэгіёнаў;

***умець:***

- умець падрыхтаваць і правесці гісторыка-краязнаўчую экскурсію;
- распрацаваць маршрут турысцкага пахода па пэўнай мясцовасці;
- характарызаваць моцныя і слабыя бакі развіцця турызму ў пэўным рэгіёне;
- выяўляць крыніцы інфармацыі пра пэўны край;
- вызначаць перспектывы развіцця турызму ў пэўным населеным пункце рэгіёну;

Репозиторий ВГУ

***валодаць:***

- навыкамі арганізацыі краязнаўчай работы;
- навыкі правядзення асветніцкай працы праз падрыхтоўку і публікацыю артыкулаў у СМІ (рэспубліканскі ці мясцовы друку, Інтэрнэце.

Праграма складзена у адпаведнасці са стандартам адукацыі РД РБ 02100. 5. 065-98 для спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры”, кваліфікацыйнай характарыстыкай і вучэбным планам, праграмай падрыхтоўкі студэнтаў па названай спецыяльнасці.

**Прыкладны тэматычны план курса**

| **№ п/п** | **Тэмы заняткаў** | **Колькасць гадзін** | | |
|---|---|---|---|---|
| | | **Лекцыі** | **Семінары** | **КСР** |
| 1. | Уводзіны ў турыстычнае рэгіёназнаўства. Развіццё гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі | 2 | 2 | ––– |
| 2. | Віцебшчына. Комплексная характарыстыка рэгіёна. Характарыстыка турысцкага патэнцыялу | 2 | 2 | ––– |
| 3. | Характарыстыка турысцкага патэнцыялу раёнаў і гарадоў Віцебшчыны | 22 | 8 | ––– |
| 4 | Характарыстыка турысцкага патэнцыялу наваколляў Віцебска (Віцебскі раён) | 2 | 6 | 2 |
| 5. | Характарыстыка турысцкага патэнцыялу рэгіёнаў Беларусі | 6 | 6 | ––– |
| | | | | |
| | УСЯГО | 34 | 24 | |

Репозиторий ВГУ

# ПРАГРАМА КУРСА
# “ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА”

**Уводзіны.** Мэты і задачы курсу. Асноўныя паняцці. Разуменне паняцця “рэгіён”, “рэгіёназнаўства”, “турыстыка”, “рэкрэацыя”. “Рэгіянальны турызм”, “Турыстычнае рэгіёназнаўства”. Раздзяленне паняццяў “турыстычны рэгіён” і “турызм у асобным рэгіёне”. Сутнасць і значэнне турыстычнага рэгіёназнаўства. Крыніцы інфармацыі.

Розныя падыходы ў вылучэнні рэгіёнаў: геаграфічны, гісторыка-культурны, эканамічны, адміністрацыйны. Рэгіёны асобных краін Еўропы: Украіны, Расіі, Германіі, Англіі, Францыі, Італіі, Польшчы. Асноўныя фактары рэгіёналізма: прыродны, этнічны, дэмаграфічны, канфесійны, палітыка-геаграфічны.

Фактары, уплываючыя на турызм у асобна ўзятым рэгіёне. Залежнасць магчымасцяў развіцця рэгіянальнага турызма ад структуры рэгіёна. Умовы развіцця рэгіянальнага турызма: знешнія (дзейнасць дзяржавы ў адносінах да рэгіёнаў) і ўнутраныя (дзейнасць рэгіянальных улад). Уплыў турызму на гаспадарчую дзейнасць рэгіёна: вытворчыя сілы, транспарт, эканоміка і інш.

Агляд літаратуры па пытаннях рэгіёназнаўства, гісторыі, эканомікі і культуры Беларускага Паазер’я, яго рэгіёнаў, населеных месцаў.

**Развіццё гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі.** Рэгіёны Беларусі. Беларускае Паазер’е, Падняпроўе, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Палессе (Гомельскае, Мазырскае, Пінскае, Берасцейскае, Загароддзе). Важнейшыя помнікі гісторыі, культуры і прыроды лакальных рэгіёнаў Беларусі.

Развіццё гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі ў IX–XIV ст. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі ў XIV–XVII ст. Развіццё гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі XVIII – пач. XX ст.

**Віцебшчына. Комплексная характарыстыка рэгіёна.** Характарыстыка Беларускага Паазер’я. Рэльеф і глебы. Рэкі і азёры. Клімат, геалогія і карысныя выкапні. Прырода: флора і фауна. Ахоўваемыя тэрыторыі і помнікі прыроды. Насельніцтва вобласці, этнічны і канфесійны склад. Гаспадарка вобласці. Прамысловасць, асноўныя прадпрыемствы. Сельская гаспадарка. Транспарт і шляхі зносін.

Сучасны адміністрацыйны падзел Віцебшчыны. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны: Аршаншчына, Браслаўшчына, Віцебшчына, Глыбоччына, Дзісненшчына, Лепельшчына, Полаччына.

Гарады вобласці. Гістарычныя экскурсы і характарыстыка эканамічнага і сацыяльнага патэнцыялу асноўных гарадоў: Віцебск, Лепель, Наваполацк, Орша, Полацк, раённых цэнтраў. Заходняя Віцебшчына. Сучасны стан вобласці.

Рэпазіторый ВДУ

**Гісторыя Віцебскай вобласці і яе асноўных населеных пунктаў.** Гісторыя Віцебска ад старажытнасці да пач. XIV ст. Палеміка вакол пытання аб заснаванні горада. Будаўніцтва горада пры князе Васільке. Уваход Віцебскай зямлі ў склад ВКЛ. Роля вялікага князя Літоўскага Альгерда ў гісторыі развіцці горада. Мяцеж Свідрыгайлы. Вітаўт у Віцебску. Ульяна Цвярская. Віцебскія замкі: Верхні (Горны), Ніжні (Дольны), Узгорскі. Віцебск у XV–XVI ст. Віцебск у Лівонскай вайне. Віцебскае мейскае права. Атрыманне горадам Магдэбургскага права. Паўстанне 1623 г. у Віцебску. Лёс горада ў вайне 1654–1667 гг. "Чарцёж г. Віцебска". Віцебск у Паўночнай вайне 1700–1721 гг. Пётр I у горадзе і лёс горада. Развіццё горада ў складзе Расійскай імперыі. Віцебск у вайне 1812 г. Напалеон у горадзе. Развіццё горада ў 1-й і 2-й палове XIX – пач. XX ст.

Віцебск у часы Першай сусветнай вайны і Грамадзянскай вайны. Бежанства. Латышы на Віцебшчыне. Асаблівасці правядзення НЭПа на Віцебшчыне. Развіццё рэгіёна ў часы індустрыялізацыі. Віцебск напярэдадні Другой сусветнай вайны.

Гісторыя Віцебска ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі за горад. Віцебскае падполле. Жыццё ў горадзе ва ўмовах акупацыі. Вызваленне горада. Аднаўленне інфраструктуры горада. Віцебск у 1950-я – першай палове 1980-х гг. Змены ў эканоміцы культуры горада ў другой палове 1980-х – 1990-я гг. Віцебск у пачатку XXI ст.

Вуліцы г. Віцебска. Памятныя і гістарычныя месцы Віцебска. Тапанімія Віцебска. Помнікі Віцебска. Памятныя шыльды Віцебска. Памятныя мясціны горада Віцебска. Славутыя землякі і ганаровыя гараджане горада.

Гісторыя Полацка, Оршы, Глыбокага. Гісторыя гарадоў і гарадскіх пасёлкаў усходняй частцы Віцебскай вобласці. Гісторыя гарадоў і гарадскіх пасёлкаў заходняй частцы Віцебшчыны.

**Характарыстыка турысцкага патэнцыялу раёнаў і гарадоў Віцебшчыны.** Турыстычны патэнцыял наваколляў Віцебска. Турыстычны патэнцыял Полаччыны. Турыстычны патэнцыял Аршаншчыны. Турыстычны патэнцыял Лепельшчыны. Турыстычны патэнцыял Заходняй Віцебшчыны. Славутыя землякі рэгіёнаў. Геральдыка населеных месцаў Віцебшчыны.

**Характарыстыка турысцкага патэнцыялу Віцебскага раёну.** Турыстычны патэнцыял Віцебскага раёну; наваколляў Віцебшчыны. Турыстычная рэсурсы паўночнай часткі Віцебскага раёна (Лосвіда, Лужасна, Мазалава). Турыстычная рэсурсы паўднёвай часткі Віцебскага раёна (Баронікі, Вароны, Копці, Ноўка, Сасноўка, Яроміна). Турыстычныя рэсурсы ўсходняй часткі Віцебскага раёна (Заронава, Лётцы, Пуцявішча, Старае Сяло). Турыстычная рэсурсы заходняй часткі Віцебскага раёна (Заполле, Руба, Сураж, Янавічы).

Рэпазіторый ВГУ

## Семінарскія заняткі па курсу
## “ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА”

### Тэма 1. **Уводзіны ў турыстычнае рэгіёназнаўства**

1. Турыстычнае рэгіёназнаўства як дысцыпліна. Паняцці “рэгіён”, “рэгіёназнаўства”, “рэгіянальны турызм”
2. Рэгіёны асобных краін Еўропы: Украіны, Расіі, Германіі, Англіі, Францыі, Італіі, Польшчы
3. Рэгіёны Беларусі (эканоміка-геаграфічныя, гісторыка-культурныя)
4. Рэгіёны Віцебшчыны (Браслаўшчына, Дзісненшчына, Глыбоччына, Полаччына, Лепельшчына, Віцебшчына, Аршаншчына)

### Літаратура:


1. Беларуская энцыклапедыя [Віцебская вобласць].
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993–2003.
3. Лакотко А.И. Историко-культурные регионы Беларуси. – Минск: ЕГУ, 2002. – 228 с.
4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск, 1985. – 496 с.
5. Геаграфія Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн., 1992. – 383 с.
6. Витебск. Историко-экономический очерк. – Минск: Наука и техника, 1974. – 224 с.
7. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск: БелСЭ, 1988. – 408 с.
8. Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы: справочник / сост. А. Матвеев. – Минск: Беларуская Православная Церковь, 2009. – 156 с.
9. Витебская область. Справочно-представительный альбом / М.П. Кузьмич, П.В. Гнутенко, Т.Л. Кузьмич. – Витебск: Витебская областная типография, 2005. – 235 с.
10. Мазоўка В. Ахоўныя прыродныя тэрыторыі і помнікі культуры Беларусі. – Мінск, 1985.


### Тэма 2. **Віцебшчына. Комплексная характарыстыка рэгіёна. Характарыстыка турысцкага патэнцыялу**

1. Комплексная характарыстыка Беларускага Паазер’я.
2. Клімат, геалогія, прырода Віцебшчыны і перспектывы яе выкарыстання ў экалагічным турызме
3. Насельніцтва, канфесійны склад, шляхі зносін. Перспектывы паломніцкага турызму і развіцця этнакультурных маршрутаў
4. Эканоміка рэгіёна і патэнцыял прамысловага турызму
5. Культурны патэнцыял і перспектывы падзейнага (фестывальнага) турызму.

### Літаратура:


1. Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы: справочник / сост. А. Матвеев. – Минск: Беларуская Православная Церковь, 2009. – 156 с.
2. Витебская область. Справочно-представительный альбом / М.П. Кузьмич, П.В. Гнутенко, Т.Л. Кузьмич. – Витебск: Витебская областная типография, 2005. – 235 с.
3. Геаграфія Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск: БелЭн, 1992. – 383 с.
4. Физическая география Витебской области: учеб. пособие / М.И. Бобрик, З.С. Гаврильчик, А.Н. Галкин и др. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2004. – 222 с.


Репозиторий ВГУ

5. Гонар і слава Віцебшчыны. Зборнік матэрыялаў конкурса “Гісторыя вядомых родаў Беларусі” / укладальнік Л. Сіманёнак. – Віцебск, 2001. – 92 с.
6. Энцыклапедыя прыроды Беларусі [Віцебская вобласць]. – Т. 1–5. – Мінск: БелСЭ, 1983–1986.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 1–6. – Мінск: БелЭн, 1993–2003.

## Тэма 3. **Характарыстыка турысцкага патэнцыялу Бешанковіцкага, Гарадоцкага, Лёзненскага, Сенненскага, Шумілінскага раёнаў**

1. Комплексная характарыстыка Віцебскага рэгіёна (Бешанковіцкі, Гарадоцкі, Лёзненскі, Сенненскі, Шумілінскі раёны)
2. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Бешанковіччыны
3. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Гарадоччыны
4. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Лёзненскага раёна
5. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Сенненскага раёна
6. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу ШумілінШчыны

### Літаратура:

1. Бандарэвіч В.В. Экскурсія да вытокаў г. Сянно: Краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры Віцебскай вобласці. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2000. – 216 с.
2. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. – Мінск: Паркус плюс, 2008. – 328 с.
3. Гісторыка-краязнаўчы курс “Наша Шумілінщчына” : Шуміліназнаўства / уклад. В.А. Падляшчук [і інш.]. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2010. – 200 с.
4. Крачкоўскі, А. Край наш Наддзвінскі. – Мінск: Полымя, 1990. – 80 с.
5. Гісторыка-дакументальная хроніка “Памяць”. Бешанковіцкі раён. – Мінск: БСЭ імя П. Броўкі, 1991. – 423 с.
6. Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў / укл. С.У. Садоўская. – Мінск: Беларусь, 2004. – 894 с.
7. Памяць: Гісторыка-дакумент. хроніка Лёзненскага раёна. – Мінск: БелЭн, 1992. – 592 с.
8. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С.В. Шайко. – Мінск: Паліграфафармленне, 2003. – 616 с.
9. Память: историко-документ. хроника Шумилинского района. – Минск: БелСЭ, 1985. – 520 с.
10. Витебск: энциклопедический справочник. – Мінск: БелСЭ, 1988. – 408 с
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 1–6. – Мінск: БелЭн, 1993–2003.

## Тэма 4. **Характарыстыка турысцкага патэнцыялу Верхнядзвінскага, Лепельскага, Полацкага, Расонскага, Ушацкага і Расонскага раёнаў**

1. Комплексная характарыстыка Полаччыны
2. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Верхнядзвінскага раёна



Репозиторий ВГУ

3. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Лепельшчыны
4. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Полацкага раёна
5. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Расонскага раёна
6. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Ушацкага раёнаў

**Літаратура:**


1. Верхнедвинский район. На крайнем севере [Жемчужины Беларуси] / автор текста А. Бубало. – Минск: Рифтур, 2013. – 47 с.
2. Грыбко В.В. Гістарычна-краязнаўчы курс "Наша Чашніччына" (Чашніказнаўства). – Мінск: Медисонт, 2007. – 228 с.
3. Каліноўскі І.І. Полацк і яго ваколіцы. – Мінск: Вышэйш. школа, 2005. – 143 с.
4. Карасёў В.Р. Ветрына і наваколле: храналогія гісторыі. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 1999. – 48 с.
5. Карта-путеводитель Полоцко-культурной зоны. – Минск, 2007.
6. Лепельский район [Жемчуж. Беларуси] / авт. текста В. Тухто. – Минск: Рифтур, 2013. – 41 с.
7. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацкага раёна. – Мінск: Вышэйшая школа, 1999. – 700 с.
8. Памяць: Гісторыка-дакумент. хроніка Лепельскага раёна. – Мінск: БелЭн, 1999. – 640 с.
9. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Ушацкага раёна / уклад. М.М. Кірпіч. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 640 с.
10. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Чашніцкага раёна. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – 542 с.
11. Полоцкий район : на земле святой Софии [Жемчужины Беларуси] / автор текста И. Калиновский. – Минск: Рифтур, 2013. – 69 с.
12. Россонский район [Жемчужины Беларуси] / автор текста И. Калиновский. – Минск: Рифтур, 2014. – 20 с.


Тэма 5. **Характарыстыка раёнаў Усходняй Віцебшчыны**

1. Комплексная характарыстыка Аршаншчыны (Аршанскі, Дубровенскі, Талачынскі раён)
2. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Аршанскага раёна
3. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Дубровенскага раёна
4. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Талачынскага раёна
5. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Сенненскага раёну
6. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Чашніцкага раёну

Репозиторий ВГУ

## Літаратура:

1. Асіноўскі С.М. Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі: Іл. храналаг. даведнік. – Мінск: Полымя, 1997. – 428 с.
2. Жуковский В.В. Оршеведение: производственно-практическое издание. – 2-е изд. – Орша: Оршанская типография, 2009. – 208 с.
3. Оршанский район: колыбель белорусского льна [Жемчужины Беларуси] / автор текста В. Кузубов. – Минск: Рифтур, 2014. – 45 с.
4. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна. – Мінск: БелСЭ, 1988. – 654 с.
5. Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. – Кн. 1. – Мінск: БелЭн, 1999. – 384 с.
6. Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. – Кн. 2. – Мінск: БелЭн, 2000. – 528 с.
7. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Дубровенскага раёна. – Кн. 1. – Мінск: Паліграфафармленне, 1997. – 598 с.
8. Память: Историко-документальная хроника Дубровенскага района. – Кн. 2. – Мінск: Паліграфафармленне, 1996. – 493 с.
9. Сенненский район [Жемчужины Беларуси] / автор текста В. Бондаревич, Н.В. Суслова. – Минск: Рифтур, 2013. – 41 с.
10. Русецкі А.У. Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў XI–XIX стст. – Мінск: БелЭн., 2002. – 232 с.
11. Шынкевіч А.М. Аршанская даўніна. – Мінск: Полымя, 1992. – 112 с.
12. Шынкевіч А.М. Орша: взгляд в прошлое. – Орша: Оршанская типография, 1992. – 26 с.
13. Шнейдер А.А. Моя Толочинщина: страницы истории. – Минск: Бизнесофсет, 2005. – 310 с.

## Тэма 6. **Характарыстыка Заходняй Віцебшчыны**

1. Комплексная характарыстыка Заходняй Віцебшчыны
2. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Браслаўшчыны
3. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Глыбоччыны
4. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Пастаўшчыны
5. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Мёрскага раёна
6. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Шаркаўшчыны
7. Характарыстыка гісторыка-культурнага і прыроднага патэнцыялу Докшыцкага раёна

## Літаратура:

1. Волкаў І. Легенды, паданні азёрнага краю. Глыбокае–Наваполацк: Вольнае Глыбокае, 2000. – 50 с.
2. Докшицкий район [Жемчуж. Бел.] / авт. текс. А. Войтехович. – Минск: Рифтур, 2014. – 45 с.

Репозиторий ВГУ

3. Очарование Миорского края / В.А. Ермалёнок, П.И. Боголей. – Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2007. – 50 с.
4. Зямчонак І. Храмы Залатога поясу Пастаў. – Мінск, 2000. – 102 с.
5. Миорский район / авт. текста В. Ермаленок. – Минск: Рифтур, 2013. – 38 с.
6. Памяць: Гісторыка-дакумент. хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск: БелЭн, 1998. – 710 с.
7. Памяць: Гісторыка-дакумент. хроніка Глыбоцкага раёна. – Мінск: БелЭн, 1995. – 454 с.
8. Памяць: Гісторыка-дакумент. хроніка Докшыцкага раёна. – Мінск: БелЭн, 2004. – 752 с.
9. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 630 с.
10. Памяць: Гісторыка-дакумент. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск: БелТА, 2001. – 688 с.
11. Памяць: Гісторыка-дакум. хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: Белта, 2004. – 512 с.
12. Скрабатун, У. Глыбокае на старых паштоўках. – Мінск–Глыбокае: БГАКЦ, 1998. – 111 с.
13. Шыдлоўскі К. Архітэктурная спадчына Браслаўшчыны. – Мінск: БелЭн, 1996. – 158 с.
14. Пракаповіч І. Ваколіцы Паставаў: Помнікі прыроды, гісторыі і культуры з маршрутамі краязнаўчых вандровак. – Паставы: Сумежжа, 2004. – 60 с.
15. Пракаповіч І. Чароўны край – Пастаўшычына: (гісторыка-краязнаўчы курс «Паставызнаўства»). – Мінск: Кнігазбор, 2009. – 304 с.
16. Шаркаўшчына і наваколле (гістарычная хроніка) / уклад. У. Ляскоўскі. – Паставы: Сумежжа, 2009. – 95 с.

Тэма 7. **Гісторыя Віцебскай вобласці і яе асноўных населеных пунктаў**

1. Гісторыя Падзвіння [у межах сучаснай Віцебскай вобласці]
2. Гісторыя Полацка
3. Гісторыя Оршы
4. Гісторыя раённых цэнтраў, гарадоў, гарадскіх пасёлкаў і населеных пунктаў Віцебшчыны [па выбары: Асвея, Багушэўск, Балбасава, Барань, Бешанковічы, Браслаў, Бягомль, Варапаева, Ветрына, Відзы, Гарадок, Глыбокае, Дзісна, Докшыцы, Дуброўна, Езярышча, Копысь, Коханава, Крулеўшчына, Лепель, Лёзна, Лынтупы, Новалукомль, Обаль, Падсвілле, Паставы, Расоны, Сураж, Сянно, Талачын, Ушачы, Чашнікі, Шаркаўшчына, Шуміліна, Янавічы] (па жаданню – падрыхтаваць і абараніць рэферат)

**Літаратура:**

1. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск: БелСЭ, 1988. – 408 с.
2. Витебск и окрестности: спр.-путеводитель / сост. З.В. Беленький, А.М. Подлипский. – Минск: Полымя, 1985. – 112 с.
3. Короткевич В.Б. Памятники истории Витебска. – Минск: Полымя, 1975. – 24 с.
4. Макараў М. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – перш. пал. XVII ст. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
5. Орша: Историко-экономический очерк. – Минск: Беларусь – 2-е изд. – Минск, 1967. – 135 с.
6. Полоцк: ист. очерк / АН БССР. Ин-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред) и др. 2-е изд. – Минск: Наука и техника, 1987. – 320 с.
7. Русецкий А.В., Русецкий Ю.А. Художественная культура Витебщины (с древности до 1917 года): пособие для студентов. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2007. – 82 с.

Репозиторий ВГУ

8. Русецкий А.В., Толочко Н.К. Ученые-уроженцы Витебщины – для инноваций Беларуси. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2007. – 144 с.
9. Штыхаў Г.В. Ажываюць сівыя стагоддзі. – Мінск: Народная асвета, 1982. – 175 с.
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі [Віцебскае ваяводства, Віцебскае княства, паўстанне, Віцебская вобласць, Віцебская акруга, Віцебская губерня; Глыбокае, Орша, Полацк, і інш]. – Т. 2. – Мінск: БелЭн, 1994.

## Тэма 8. **Віцебск як аб'ект комплекснага турыстычнага вывучэння**

1. Гісторыя Віцебска
2. Помнікі гісторыі і культуры горада
3. Геральдыка населеных месцаў Віцебшчыны
4. Вуліцы Віцебска
5. Памятныя мясціны горада Віцебска
6. Музеі горада

### Літаратура:

1. Витебск: энциклопедический справочник. – Минск: БелСЭ, 1988. – 408 с.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск: БСЭ, 1985. – 496 с.
3. Короткевич В.Б. Памятники истории Витебска. – Мінск: Полымя, 1975. – 24 с.
4. Витебск и окрестности: спр.-путеводитель / сост. З.В. Беленький, А.М. Подлипский. – Минск: Полымя, 1985. – 112 с.
5. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. – Кн. 1. – Мінск: БелЭн, 2002. – 648 с.
6. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. – Кн. 2. – Мінск: БелЭн, 2003. – 680 с.
7. Плавінскі М. Юр'ева горка з арліных вышынь. – Віцебск: Друк. імя Камінтерна, 1994. – 13 с.
8. Подлипский А.М. Евреи в Витебске: в 2-х т. Т. 1. – Витебск: Витебская областная типография, 2004. – 176 с.
9. Подлипский А., Рогач В. Доски, берегущие память: справочник. – Витебск.: Витеб. обл. тип., 2006. – 95 с.
10. Якімовіч Ю.А. Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска XIX – пачатку XX ст. – Мінск: Полымя, 1990. – 46 с.

## Тэма 9. **Характарыстыка турысцкага патэнцыялу бліжэйшых наваколляў Віцебска**

1. Турызм нядзельнага адпачынку – плюсы і мінусы
2. Турыстычная рэсурсы бліжэйшых наваколляў горада
3. Турыстычны маршрут у наваколлях Віцебска (актыўны варыянт)
4. Турыстычны маршрут у наваколлях Віцебска (школьны варыянт)
5. Турыстычны маршрут у наваколлях Віцебска (варыянт для пенсіянераў)
6. Помнікі прыроды, ахоўваемыя тэрыторыі, рэкрэацыйны патэнцыял наваколляў Віцебска
7. Помнікі гісторыі і культуры наваколляў горада
8. Гістарычныя і памятныя мясціны наваколляў Віцебска

Репозиторий ВГУ

## Літаратура:

1. Витебск и окрестности: спр.-путеводитель / сост. З.В. Беленький, А.М. Подлипский. – Минск: Полымя, 1985. – 112 с.
2. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. – Мінск: Паркус плюс, 2008. – 328 с.
3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская воблаць. – Мінск, 1985. – 496 с.
4. Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. У.І. Мезенцаў. – Мінск: Маст. літ., 2004. – 772 с.
5. Пивовар Н.В. Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска. – Витебск, 2002. – 116 с.
6. Пивовар Н.В. Маршрутами Придвинья. – Витебск: Обл. комитет по спорту и туризму, 2007. – 16 с.
7. Подлипский, А. Великан Федор Махнов. – Витебск: Обл. типография, 1993. – 32 с.
8. Школьные туристские маршруты по Белоруссии. – Минск: Нар. асвета, 1969. – 126 с.
9. Юшкевич М.Д. Витебский великан. – Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2007. – 24 с.


## Тэма 10. **Характарыстыка турысцкага патэнцыялу Брэсцкай і Гродзенскай абласцей**

1. Турыстычны патэнцыял Брэста
2. Рэкрэацыйны патэнцыял Брэсцкага Палесся
3. Рэкрэацыйны патэнцыял Пінскага Палесся і Загароддзя
4. Турыстычны патэнцыял Гродна
5. Турыстычны патэнцыял Панямоння


## Літаратура:

1. Брест: энцикл. справ. / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1987. – 408 с.
2. Гродно: энцикл. справ. / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1989. – 483 с.
3. Курков И.Н. Брестчина: легенды, события, люди. – Минск: Медиафакт, 2004. – 304 с.
4. Мальдзіс А. Астравеччына, край дарагі… – Мінск: Мастацкая літаратура, 1977. – 207 с.
5. Памятники истории и культуры Гродненщины: библиографический указатель литературы / сост. Г.М. Таюрская. – Гродно: ГАНБ, 1984. – 41 с.
6. Пяткевіч А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: даведнік. – Гродна: ГрДУ, 2000. – 356 с.
7. Принеманский край. Города и райцентры: Библиографический указатель литературы по истории Гродно / Е.М. Таюрская (сост.). – Гродно: ЦСУ г. Гродно, 1980. – 108 с.


## Тэма 11. **Характарыстыка турысцкага патэнцыялу Магілёўскай і Гомельскай абласцей**

1. Турыстычны патэнцыял Магілёва
2. Рэкрэацыйны патэнцыял Верхняга Падняпроўя
3. Рэкрэацыйны патэнцыял Гомельскага і Мазырскага Палесся
4. Турыстычны патэнцыял Гомеля
5. Турыстычны патэнцыял Пасожжа

Репозиторий ВГУ

## Літаратура:

1. Курков И., Пушкин И. Могилевщина. Легенды, события, люди. – Минск: Медиафакт, 2005. – 272 с.
2. Дулов А.Н., Дюхова К.А., Д.В. Юрчак. История путешествий и туризма: монография. – Витебск: ВГУ им. П.М. Машерова, 2011. – 139 с.
3. Гордеев П.Б. Могилевщина: Памятники бессмертной славы. – Минск: Полымя, 1986. – 143 с.
4. Городецкий М.Н., Е.А.Крисковец. Могилёв и окрестности: спр.-путеводитель. – Минск: Полымя, 1982. – 112 с.
5. Могилев: энцикл. справ. / редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1990. – 472 с.

## Тэма 12. **Характарыстыка турысцкага патэнцыялу Мінскай вобласці і горада Мінска**

1. Турыстычны патэнцыял Мінская вобласці
2. Рэкрэацыйны патэнцыял Нясвіжа, Слуцка, Маладзечна, Барысава
3. Турыстычны патэнцыял Мінска
4. Музеі Мінска і Мінскай вобласці
5. Помнікі гісторыі і культуры сталіцы

## Літаратура:

1. Корсак, Д.А. Минщина : легенды, события, люди. – Минск: Медиафакт, 2011. – 304 с.
2. Загорульский, Э.М. Древний Минск. – Минск: Госиздат БССР, 1963. – 119 с.
3. Памятники Минска: справ.-путевод. / авт.-сост. В.П. Шамов. – Минск: Полымя, 1991. – 208 с.
4. Мы расскажем о Минске / сост. С. Граховский, В. Карпов, Р. Соболенко. – Минск: Беларусь, 1966. – 212 с.
5. Чантурыя, У.А., Казакоў Ю.І. Архітэктурныя помнікі Нясвіжа. – Мінск: Полымя, 1989. – 47 с.
6. Шишигина, К.Я. Музы Несвижа / К.Я. Шишигина. – Минск: Полымя, 1986. – 139 с.
7. Шыбека З.В., Шыбека С.Ф. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. – Мінск: Полымя, 1990. – 341 с.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭСТЫ ПА КУРСУ “ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА”

1. Прыгадайце, якую плошчу займае Віцебская вобласць?
2. Прыгадайце некалькі нацыянальнасцяў, якія пражываюць у Віцебскай вобласці.
3. Найвышэйшай кропкай Віцебскай вобласці з’яўляецца ______.
4. Назавіце самае вялікае возера Віцебшчыны.
5. Самым глыбокім возерам Віцебскай вобласці з’яўляецца ______.
6. Узгадайце, як называецца возера з самай вялікай берагавой лініяй у Беларусі (знаходзіцца на Віцебшчыне)?

Репозиторий ВГУ

7. Самы вялікі камень на Беларусі знаходзіцца каля вёскі _____ Шумілінскага раёна.
8. Назавіце колькасць насельніцтва Віцебскай вобласці напачатку XXI ст.
9. Колькі адміністрацыйных раёнаў уваходзіць у склад Віцебскай вобласці?
10. Колькі адміністрацыйных раёнаў уваходзіць у склад Віцебска?
11. Прыгадайце 5 найбуйнейшых гарадоў Віцебшчыны.
12. Прыгадайце 5 найбольш цікавых прыродных аб’ектаў і ахоўваемых тэрыторый Віцебшчыны.

*Віцебскі раён і бліжэйшыя наваколлі*

1. Назавіце вёску ў Віцебскім раёне, у якой адпаведна паданням з зямлі растуць крыжы.
2. Назавіце прозвішча заснавальніка музея “Гісторыя Заронаўскага краю”.
3. Сядзіба “Мілае” ў в. Мазалава Віцебскага павета была закладзена беларускім асветнікам, віцэ-губернатарам Віцебскай губерні, чалавекам, якога некаторыя гісторыкі лічылі аўтарам паэмы “Энеіда навыварат”. Назавіце яго імя.
4. У якім стылі пабудавана сядзіба “Мілае” ў в. Мазалава Віцебскага раёна?
5. Рэшткі вадзяного млына на р. Лужаснянка можна наведаць у вёсцы _______ Віцебскага раёна.
6. Помнік у гонар няўдалага наступлення (25.12. (31).12. 1943) знаходзіцца каля вёскі ______ Віцебскага раёна
7. Сакральны валун “Камень Кахання” знаходзіцца каля вёскі _______ Віцебскага раёна
8. Якую прадукцыю выпрабляе біяфабрыка ў в. Доўжа Віцебскага раёна?
9. Назавіце прозвішча выдатнага беларускага ветэрынарнага доктара, імя якога носіць біяфабрыка ў в. Доўжа Віцебскага раёна?
10. Сістэма азёр – Сосна, Цыганоўскае, Малае, Сярэднее, Канавалаўскае знаходзіцца каля вёскі _____ Віцебскага раёна.
11. Батанічны заказнік “Чортава барада” знаходзіўся каля в. _____ (цяпер вуліца Арэхавая г. Віцебска)
12. У якім стылі ўзведзены будынак былой Земляробчай школы ў Лужасна?
13. У якім стылі ўзведзена Узнясенская (Пакроўская) царква ў 1908 г. у п. Лужасна?
14. Тэмпературны мінімум на Беларусі быў зарэгістраваны ў 1940 г. Дзе гэта адбылося?
15. Назавіце тэмпературны мінімум, зарэгістраваны на Беларусі ў 1940 г.
16. Назавіце некалькі рэдкіх дрэваў, якія вырастаюць на тэрыторыі помніка прыроды мясцовага значэння “Лужаснянскі дэндрапарк”
17. Помнік прыроды “Браты” знаходзіцца ў вёсцы ______ Віцебскага раёна.
18. Дуб і ясень, якія растуць з аднаго кораня ў п. Лужасна называюцца “____________”.
19. Назавіце прозвішча першага камсамольца Беларусі, які стаў героем Савецкага Саюза ў гады Вялікай Айчыннай вайны, помнік якому ўсталяваны на чыг. станцыі Лужасна.
20. Назавіце прозвішча выдатнага партыйнага, адміністрацыйнага дзеяча БССР, ураджэнца в. Суднікі Віцебскага раёна, які разам з П.М. Машэравым кіраваў краінай ў 1-й пал. 1960 – 1970-я гг.

Рэпазіторый ВДУ

21. Курганны могільнік ва ўрочышчы “Кахоўка” (57 курганоў, праводзіў раскопкі Е. Раманаў) знаходзіцца каля вёскі _______ Віцебскага раёна.
22. Памятны знак на месцы маёнтка выдатнага беларускага гісторыка і краязнаўцы А.П. Сапунова ва ўрочышчы “Кахоўка” знаходзіцца каля вёскі _______ Віцебскага раёна.
23. Памятная шыльда на месцы пахавання Я.В. Рэпіна – бацькі знакамітага мастака знаходзіцца на могілках у г.п. ________ Віцебскага раёна.
24. Як называецца другі па велічыні кар’ер у Еўропе, які знаходзіцца каля р.п. Руба?
25. Як называецца парода, якая здабываецца ў кар’еры “Гралёва”?
26. Як называецца вытворчае аб’яднанне, якое займаецца здабычай і пераапрацоўкай даламіта, якое знаходзіцца ў г.п. Руба?
27. Якую назву даў выдатны рускі мастак І.Я. Рэпін свайму маёнтку каля Віцебска?
28. Прыгадайце назву карціны, прадаўшы якую І.Я. Рэпін змог набыць сабе маёнтак каля Віцебска?
29. Як называецца вадзяны мох, адзінае месца вырастання якога на Беларусі знаходзіцца каля р.п. Руба?
30. Назавіце найбольш вядомыя карціны, якія былі напісаны І.Я. Рэпіным у віцебскі перыяд жыцця?
31. У пачатку XIX ст. на гарадзішчы і паселішчы ў в. Ст. Сяло Віцебскага павета праводзіў раскопкі заснавальнік беларускай, рускай, украінскай археалогіі, фальклnetwork, тапанімікі ____________.
32. Прыгадайце імёны двух герояў Герояў Савецкага Саюза, якія пахаваны ў в. Старае Сяло Віцебскага раёна.
33. Стваральнікам музея ў школе ў в. Старае Сяло з’яўляецца вядомая ў Віцебскім раёне краязнаўца ___________.
34. Каля в. Якуціна непадалёк ад в. Старае Сяло Віцебскага раёна знаходзяцца рэшткі парка вядомага віцебскага ўрача, вынаходніка, які вёў перапіску з Львом Талстым. Назавіце ягонае імя.
35. Самае глыбокае месца на Дзвіне ў межах Беларусі знаходзіцца каля вёскі _________ Віцебскага раёна.
36. Якому шляхецкаму роду належала сядзіба ў в. Лукі сучаснага Віцебскага раёна.
37. Назавіце рэчку, у пойме якой вырастае запаветная дубрава, якая ахоўваецца як батанічны заказнік “Прыдзвінне” ў Віцебскім раёне.
38. Прыгадайце назву не атрутнай змяі, якая занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі і сустракаецца на тэрыторыі заказніка “Прыдзвінне”.
39. Месца былой сядзібы генерала ад кавалерыі У.І. Андрыянава знаходзіцца ў вёсцы _______ Віцебскага раёна.
40. Прыгадайце прозвішча генерала ад кавалерыі, удзельніка руска-турэцкай вайны 1877–1878, героя Шыпкі. Каменны крыж з магілы з яго магілы знаходзіцца каля школы ў в. Старае Сяло Віцебскага раёна.
41. Некаторыя лічаць, што ў пойме гэтай рэчкі людзі губляюцца ў часе. Назавіце яе __________.
42. Месца, дзе знаходзяцца караблі зімой на Дзвіне, называецца __________.

Репозиторий ВГУ

43. Напоўразбураны курган-сопка вышынёй 4 м., які ў XIX ст. называўся “Лавачнік” знаходзіцца ў вёсцы ___________ Віцебскага раёна.
44. Вялікі батанічны сад, які быў вядомы ў Еўропе, быў закладзены батанікам Ул. Адамавым у сваім маёнтку ў вёсцы _________ Віцебскага павета.
45. Вядомы геабатанік, фларыст, дэндролаг, пражываў у сваім маёнтку каля Віцебска. Сад, закладзены навукоўцам, быў перанесены ў Віцебск і стаў асновай гарадскога батанічнага сада.
46. Як называецца мінеральная вада, якая з’яўляецца візітовай карткай санаторыя “Лётцы”?
47. Назавіце вёску, якая існавала ў XIX ст. у Віцебскім павеце, а ў паэме “Тарас на Парнасе” стала месцам жыхарства галоўнага героя паэмы _______.
48. Назавіце возера ў Віцебскім і Гарадоцкім раёнах, на якім знаходзіцца цікавы гісторыка-культурны і прыродны аб’ект “Напалеонаўская дарога” ____________.
49. Прыгадайце некалькі версій утварэння ўнікальнага прыроднага аб’екта “Напалеонаўская дарога”.
50. Назавіце самую атрутную расліну Еўропы, якая распаўсюджана на берагах азёр і рэк наваколляў Віцебска.
51. Назавіце расліну, якая з’яўляецца самым вялікім медазборам у Беларусі.
52. Назавіце вёску ў Гарадоцкім раёне, каля якой знаходзіцца дуб-волат, узрост якога датуецца 300–600 гадоў.
53. Самы вялікі курганны могільнік у Беларусі адкрыў каля в. Дарахі Гарадоцкага раёна і ўвёў навуковы зварот краязнаўца ___________.
54. Верагоднае месца пакланення жаночаму бажаству, апякунцы дзетанараджэння ў Гарадоцкім раёне знаходзіцца каля вёскі _____ і возера __________.
55. Вялікая курганная група, якая ўключае 57 насыпаў і памятны знак на месцы сядзібы “Кахоўка” вядомага віцебскага гісторыка, археографа _________ знаходзіцца каля в. __________ Віцебскага раёна.
56. Прыгадайце прозвішча мастака, які нарадзіўся у в. Старае Сяло Віцебскага раёна, адукацыю атрымаў у Кракаўскім універсітэце, вучыўся ў вядомага польскага мастака Я. Матэйкі ________.
57. Прыгадайце імя чалавека, які нарадзіўся ў в. Касцюкі непадалёк ад в. Ст. Сяло Віцебскага павета і лічыцца самым высокім у свеце _______.
58. Назавіце рост самага высокага чалавека ў свеце, які нарадзіўся ў в. Касцюкі непадалёк ад в. Старае Сяло Віцебскага раёна.
59. Дзе ў Віцебскім раёне можна ўбачыць помнік І. Сталіну?
60. У якіх вёсках у наваколлях Віцебска знаходзяцца помнікі на месцах баёў 1812 г.
61. Памятны крыж на месцы загубы ахвяраў сталінскіх рэпрэсій у 1933–1937 гг. усталяваны каля возера ____, якое знаходзіцца каля вв. _____ і ______.
62. Вёска ______ Віцебскага раёна з’яўляецца радзімай выдатнага беларускага этнографа і краязнаўцы М.Я. Нікіфароўскага
63. Вёска ______ Віцебскага раёна з’яўляецца радзімай выдатнага беларускага пісьменніка М. Лынькова.
64. Помнік “Віцебскія вароты” ўсталяваны ў вёсцы _________ Віцебскага раёна.

65. Што аб’ядноўвае вёскі Заполле, Пудаць (Запольскі с\с), в. Пунішча (Запольскі с\с) Віцебскага раёна?
66. Арніталагічны заказнік “Дымаўшчына” знаходзіцца каля в. _____ Віцебскага раёна.
67. Палігон Мабільных войскаў Рэспублікі Беларусь, які знаходзіцца непадалёк ад Віцебска мае назву _______.
68. Самая вялікая хвоя на Беларусі, радыус якой 142 см расце непадалёк ад вёскі _______ Віцебскага раёна.
69. Прыгадайце вёску ў Віцебскім раёне, каля якой знаходзіцца плодагароднінны пітомнік, месца акліматызацыі раслін да ўмоў паўночнай Віцебшчыны.
70. Прыгадайце назву вёскі, у якой размяшчаюцца галоўныя аб’екты птушкафабрыкі “Ганна”.
71. Выдатны паэт, фальклярыст, кнігавыдавец, мастак А. Рыпінскі нарадзіўся ў вёсцы _____ Віцебскага павета.
72. Аэрадром, на якім праводзіліся спаборніцтвы па верталётным спорце, месца, дзе можна замовіць скачкі з парашутам, паглядзець самалёты і верталёты знаходзіцца каля вёсцы _____ Віцебскага раёна.
73. Насыпныя горы, якія выкарыстоўваюцца як месца адпачынку гарналыжнікаў, знаходзяцца ў 15 км ад Віцебска каля рабочага пасёлка ______.
74. Унікальны помнік дзецям-заложнікам М.П. Шмырова знаходзіцца ў г.п. ______ Віцебскага раёна.
75. Геалагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння “Суражскія агаленні” знаходзіцца на берагах рэк Дзвіна, _____ і ______.
76. Хвоя “Чортавы пальцы/Ведзьміна лапа” – адна з самых вялікіх на Беларусі знаходзіцца каля в. _______.
77. Вёска ______ Віцебскага раёна, – радзіма Гераніма Марцінкевіча (паэт, празаік, драматург), аўтара камедыі адной з першых на беларускай мове “Адвячорак: аказія ў карчме пад Фальковічамі” (1858).
78. Назавіце вёску ў наваколлях Віцебска, дзе праводзяцца мотакросы.
79. Г.п. Янавічы з’яўляецца радзімай савецкага партыйнага і палітычнага дзеяча Савецкай Расіі, што ў якасці палітычнага саветніка Гаміньдана адыграў важную ролю ў галоўных падзеях гісторыі Кітая ў 1920-я гады. Назавіце яго імя.
80. Першы віцебскі метэаролаг А.С. Бялыніцка-Бірулі пабудаваў станцыю назіранняў за прыродай у в. _____ Віцебскага павета (зараз не існуе).
81. Вядомы рэлігійны дзеяч ВКЛ Сільвестр Косаў нарадзіўся ў в. _____ Віцебскага павета.
82. Назавіце месца нараджэння выдатнага дзеяча ВКЛ Л. Сапегі, калі вядома, што цяпер гэта вёска ў Бешанковіцкім раёне
83. Аўтарам паэмы “Тарас на Парнасе” з’яўляецца беларускі паэт _______.
84. Радзімай К. Вераніцына, аўтара паэмы “Тарас на Парнасе” з’яўляецца в. _______ Гарадоцкага раёна.
85. Музей “Патрыёты Обальшчыны” знаходзіцца ў г.п. _______ Шумілінскага раёна.
86. Рэспубліканскі паляўнічы заказнік “Казянскі” знаходзіцца ў _______ раёне Віцебскай вобласці.
87. Вёска _____ Шумілінскага раёна з’яўляецца радзімай вядомага беларускага

Рэпазіторый ВДУ

гісторыка і архівіста Дз.І. Даўгялы (1868–1942).
88. Рэшткі сядзібы Хлюдзінскіх пабудаванай у 1912 г. архітэктарам Б. Скотам знаходзяцца ў в. ______ Шумілінскага раёна
89. Сядзіба Хлюдзінскіх, пабудаваная архітэктарам Б. Скотам у 1912 г. была ўзведзена ў папулярным на той час стылі _______.
90. У в. Лескавічы Шумілінскага раёна на будынку школы ўсталявана мемарыяльная шыльда ў гонар ______, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся кіраўніком БШПР.
91. Прыгадайце назву вёскі, дзе прайшло дзяцінства бласлаўлёнай Цаліны Бажэнцкай (Хлюдзінскай), заснавальніцы кангрэгацыі (ордэна) Сясцёр Уваскрасення.
92. Вёска Ужляціна Шумілінскага раёна з'яўляецца радзімай свяшчэнамучаніка _______, пратаіерэя Віцебскага (1863–1934).
93. Ансамбль былога палаца Храптовічаў і фрагменты парку XVII – першай пал. XVIII ст. знаходзіцца ў г. _______ Віцебскай вобласці.
94. Адзіная шорная фабрыка (цяпер толькі цэх) ў нашай краіне знаходзіцца ў г. _______ Віцебскай вобласці.
95. Класічная стаянка эпохі мезаліту, якая знаходзіцца на Крывінскім тарфяніку ў Бешанковіцкім раёне, мае назву ______.
96. Рэшткі палаца-паркавага комплекса Цэханавецкіх можна ўбачыць у в. ________ Бешанковіцкага раёна.
97. Верагодным аўтарам парка ў сядзібе Цэханавецкіх у Бачэйкава з'яўляўся французскі паркавы архітэктар, аўтар праекта парка ў Версалі ______.
98. Рэшткі парка "Саломінка", які быў заснаваны віцебскім ваенным урачом Красавіцкім, знаходзіцца каля в. ______ Бешанковіцкага раёна.
99. Прыгадайце месца, якое лічыцца радзімай вядомага мастака Івана Хруцкага.
100. Прыгадайце назву найбольш вядомай базы адпачынку ў Бешанковіцкім раёне, якая знаходзіцца ў падпарадкаванні Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ ПА КУРСУ "ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА"

1. Замкі Віцебшчыны
2. Палацы Віцебшчыны
3. Сядзібы Віцебшчыны
4. Паркі Віцебшчыны
5. Распрацоўка маршрута "На радзіму герояў" [славутыя землякі]
6. Літаратурная Віцебшчына
7. Містычная Віцебшчына [месцы, звязаныя з праявамі незвычайнага]
8. Самая-самая Віцебшчына [незвычайныя, выдатныя месцы рэгіёну]
9. Віцебшчына для лянівых [незвычайныя месцы адпачынку і тур. цікавасці]
10. Віцебшчына археалагічная (па старажытных і знакавых помніках)

Репозиторий ВГУ

11. Азёры Віцебшчыны [азёры як тураб'екты]
12. Запаветныя куткі рэгіёну (заказнікі, запаведнікі)
13. Помнікі прыроды Віцебшчыны
14. Экстрэмальны турызм на Віцебшчыне
15. Легенды і паданні азёрнага краю
16. Сакральныя святыні Віцебшчыны [найбольш значныя канфес. святыні]
17. Вандроўка па праваслаўных святынях Віцебшчыны
18. Пілігрымка па каталіцкіх святынях Віцебшчыны
19. Віцебшчына яўрэйская [месцы памяці, нараджэння выдатных дзеячаў]
20. Лепшыя аграсядзібы Віцебшчыны (аграрны турызм)
21. Фестывальны турызм на Віцебшчыне
22. Некропалі Віцебшчыны
23. Прамысловы турызм на Віцебшчыне (прадпрыемствы – тураб'екты)
24. Па месцах бітваў сярэднявечча на Віцебшчыне
25. Па шляхах аперацыі "Багратыён" [па найбольш адметных месцах]
26. Ландшафтна-пейзажны турызм на Віцебшчыне
27. Сэлфі-турызм на Віцебшчыне [арыгінальныя месцы, з аргументацыяй]
28. 10 незвычайных помнікаў, якія варта наведаць на Віцебшчыне
29. Халакост на Віцебшчыне
30. Віцебшчына музычная [канцзалы, творы, песні, кампазітары]
31. Віцебшчына спартыўная (спарткомплексы, дасягненні, спартоўцы)
32. Этна-культурныя маршруты Віцебска і Віцебшчыны (латышы, немцы, палякі, французы, рускія, італьянцы, чэхі і інш.).
33. Віцебшчына польская (экскурсія для палякаў)
34. Паляўнічая Віцебшчына
35. Кулінарная Віцебшчына [рэстараны, кафэ з традыц. кухняй]
36. Музейная Віцебшчына [лепшыя музеі рэгіёну]
37. Валуны Віцебшчыны [геалагічныя помнікі рэгіёну]
38. Святыя крыніцы Віцебшчыны
39. Краязнаўчая віктарына "Ці ведаеце вы Віцебшчыну?"
40. Кніга рэкордаў Віцебшчыны [найбольш цікавыя факты]
41. Сураж: гісторыя і культура горада
42. Экскурсія ў в. Янавічы
43. Экскурсія ў в. Старое Сяло
44. Экскурсія і цікавыя месцы Лужасна
45. Вандроўкі ў Вялікія і Малыя Лётцы
46. Краязнаўчая віктарына "Ці ведаеце вы Віцебскі раён?"
47. Гістарычныя і памятныя мясціны наваколляў Віцебска
48. Турыстычны маршрут "Помнікі прыроды і ахоўваемыя тэрыторыі наваколляў Віцебска"

Репозиторий ВГУ

49. Помнікі гісторыі і культуры наваколляў Віцебска
50. Возера Лосвіда як аб'ект турызма [распрацоўка маршрута па наваколлях возера]

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ "ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА"

1. Турыстычнае рэгіёназнаўства як дысцыпліна
2. Формы, метады, віды, рэгіёназнаўчай дзейнасці: асветніцка-адукацыйная, навуковая, грамадская, выдавецкая
3. Рэгіёны Беларусі. Рэгіёны асобных краін Еўропы
4. Эканоміка-геаграфічныя раёны Беларусі. Развіццё гісторыка-культурных рэгіёнаў Беларусі ў XIV – XX ст.
5. Сучасны стан Віцебскай вобласці
6. Гісторыя Віцебска
7. Гісторыя Полацка
8. Гісторыя Оршы
9. Гісторыя раённых цэнтраў (на выбар)
10. Турыстычныя рэсурсы Полаччыны (Верхнядзвінскі, Лепельскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі, Чашніцкі раёны)
11. Турыстычныя рэсурсы Аршанскага раёна
12. Турыстычныя рэсурсы Бешанковіцкага раёна
13. Турыстычныя рэсурсы Верхнядзвінскага раёна
14. Турыстычныя рэсурсы Віцебскага раёна
15. Турыстычныя рэсурсы Гарадоцкага раёна
16. Турыстычныя рэсурсы Дубровенскага раёна
17. Турыстычныя рэсурсы Лепельскага раёна
18. Турыстычныя рэсурсы Лёзненскага раёна
19. Турыстычныя рэсурсы Полацкага раёна
20. Турыстычныя рэсурсы Расонскага раёна
21. Турыстычныя рэсурсы Сенненскага раёна
22. Турыстычныя рэсурсы Талачынскага раёна
23. Турыстычныя рэсурсы Ушацкага раёна
24. Турыстычныя рэсурсы Чашніцкага раёна
25. Турыстычныя рэсурсы Шумілінскага раёна
26. Турыстычныя рэсурсы Браслаўшчыны
27. Турыстычныя рэсурсы Глыбоччыны
28. Турыстычныя рэсурсы Докшыцкага раёна
29. Турыстычныя рэсурсы Мёршчыны
30. Турыстычныя рэсурсы Пастаўшчыны
31. Турыстычныя рэсурсы Шаркаўшчынскага раёна
32. Турыстычныя рэсурсы Віцебска

Репозиторий ВГУ

33. Музеі г. Віцебска і Віцебскай вобласці
34. Гістарычныя і памятныя мясціны наваколляў Віцебска
35. Помнікі гісторыі і культуры наваколляў Віцебска
36. Турыстычная рэсурсы Віцебскага раёна (Лосвіда, Лужасна, Мазалава)
37. Турыстычная рэсурсы Віцебскага раёна (Баронікі, Вароны, Копці, Ноўка, Сасноўка, Яроміна)
38. Турыстычная рэсурсы Віцебскага раёна (Заполле, Руба, Сураж, Янавічы)
39. Турыстычная рэсурсы Віцебскага раёна (Заронава, Лётцы, Пуцявішча, Старае Сяло)
40. Турыстычныя рэсурсы Полацка
41. Турыстычныя рэсурсы Оршы
42. Геральдыка населеных месцаў Віцебшчыны
43. Сядзібы і палацы Віцебшчыны
44. Паркі Віцебшчыны
45. Выдатныя дзеячы Віцебшчыны
46. Прыкладны экалагічны маршрут па Віцебшчыне
47. Крыніцы інфармацыі па турыстычным рэгіёназнаўству
48. Сядзібы Беларусі
49. Палацы і паркі Беларусі
50. Замкі Беларусі
51. Турыстычныя рэсурсы Гомельшчыны
52. Турыстычныя рэсурсы Магілёўшчыны
53. Турыстычныя рэсурсы Міншчыны
54. Турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны
55. Турыстычныя рэсурсы Брэстчыны
56. Мінск як турыстычны аб’ект

Репозиторий ВГУ

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ ПА КУРСУ
## “Турыстычнае рэгіёназнаўства”


1. Бандарэвіч В.В. Экскурсія да вытокаў г. Сянно: Краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры Віцебскай вобласці. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2000. – 216 с.
2. Витебская епархия. Монастыри, храмы и приходы: справочник / сост. А. Матвеев. – Мн.: Беларуская Православная Церковь, 2009. – 156 с.
3. Витебская область. Справочно-представительный альбом / Кузьмич М.П., Гнутенко П.В., Кузьмич Т.Л. – Витебск: УПП «Витебская областная типография», 2005. – 235 с.
4. Витебск: энциклопедический справочник. – Мн.: БелСЭ, 1988. – 408 с.
5. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; аўт.-уклад. М.В. Півавар. – Мн.: Паркус плюс, 2008. – 328 с.
6. Гістарычна-краязнаўчы курс “Наша Чашнiччына” (Чашнiказнаўства). – Мн.: Медисонт, 2007. – 228 с.
7. Гісторыка-дакументальная хроніка “Памяць”. Па раёнах
8. Гісторыка-краязнаўчы курс “Наша Шумілiншчына”: Шуміліназнаўства / уклад. В.А. Падляшчук [і інш.]. – Віцебск: ВАД, 2010. – 200 с.
9. Гонар і слава Віцебшчыны. Зборнік матэрыялаў конкурса “Гісторыя вядомых родаў Беларусі” (укладальнік Л. Сіманёнак). Віцебск, 2001. – 92 с.
10. Крачкоўскі А. Край наш Наддзвінскі. – Мн.: Полымя, 1990. – 80 с.
11. Калиновский И. И. Полоцк – путеводитель. – Мн.: Рифтур, 2002. – 42 с.
12. Каліноўскі І.І. Полацк і яго ваколіцы. – Мн.: Вышэйшая школа, 2005. – 143 с.
13. Миорский район: прошлое и настоящее, природа и люди / Мателенок Л., Смертьева А. [тэкст]. – Новополоцк: Новополоцкая типография, б.г. – 21 с.
14. Пивовар Н.В. Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска. – Витебск, 2002. – 116 с.
15. Пивовар Н.В. Маршрутами Придвинья. – Витебск: Обл. комитет по спорту и туризму, 2007. – 16 с.
16. Полацк музейны. Фотаальбом /аўт.-уклад. Т.А. Джумантаева, М.М. Ільніцкі. – Мн.: Беларусь, 2006. – 283 с.
17. Пракаповіч І. Чароўны край – Пастаўшычына : (гісторыка-краязнаўчы курс «Паставызнаўства»). – Мн.: Кнігазбор, 2009. — 304 с.
18. Шнейдер А.А. Моя Толочинщина: страницы истории. – Мн.: Бизнесофсет, 2005. – 310 с.
19. Шынкевіч А.М. Аршанская даўніна. – Мн.: Полымя, 1992. – 112 с.
20. Энцыклапедыя прыроды Беларусі [Віцебская вобласць]. – Т. 1–5. – Мн.: БелСЭ, 1983–1986.
21. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 1–6. – Мн.: БелЭн, 1993–2003.


Репозиторий ВГУ

# СПІС ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ І ПРЫРОДНЫХ ТУРЫСТЫЧНЫХ АБ’ЕКТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## Бешанковіцкі раён

1. **Бешанковічы** (Ансамбль былога палаца Храптовічаў, гаспадарчыя пабудовы, фрагменты парку XVII – першая палова XVIII ст.; Свята-Ільінская царква; сядзіба “Стары Марынфельд”, бровар, гасп. пабудовы; Бешанковіцкі тэт-дэ-пон 1812 г. стэла ў гонар загінуўшых камсамольцаў і моладзі, на месцы якой быў помнік У. Леніну, раней помнік Аляксандру I; будынкі былых складоў на беразе Дзвіны, капліца на могілках; мост падвясны; радзіма мастака С. Юдовіна; памятны знак у гонар землякоў; былы дуб Напалеона)

2. **Асавец** (стаянкі “Асавец 1–4” (5-е тыс. да н.э.), узорныя археалагічныя комплексы эпохі мезаліту, Крывінскі тарфянік; драўляная фігурка качкі)

3. **Астроўна** (радзіма вядомага грамадска-палітычнага дзеяча ВКЛ XVI ст. Льва Сапегі; месца бітвы рускіх і французскіх войскаў 13–14 (25–26.).07. 1812 г.; Траецкая царква (XVI ст., перабудавана)

4. **Бачэйкава** (рэшткі палаца-паркавага комплекса Цэханавецкіх, парк (пасля 1769 г., верагодны аўтар французскі паркавы архітэктар, аўтар праектаў парка ў Версалі – Леблон); яўрэйскія могілкі; брацкая магіла чырвонаармейцаў, загінуўшых у 1918 г.; помнік землякам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны; камень-следавік; курганы; якар)

5. **Будзілава** (месца фарсіравання Дзвіны 25.06. 1944 г. і акружэння фашыстаў у віцебскім “катле”);

6. **Гняздзілава** (месца злучэння войскаў 43 Арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту і 39-й Арміі 3-га Беларускага фронту)

7. **Верхняе Крывіна** (месца стварэння таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі “Бараўцы–Крывіна” у чэрвені 1918 г.)

8. **Галыні** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (пахаваны 4 Героі Савецкага Саюза: А.П. Возлікаў, У.К. Далгоў, С.І. Іларыёнаў, А.А. Саркісянц).

9. **Дабрыгоры** (Мікалаеўская царква (2-я палова XIX ст., драўляная), рэшткі парка “Саломінка” (1906)

10. **Двор Нізгалава** (комплекс былой сядзібы Мядзвецкіх “Нізгалава”: сядзібны дом, флігель, кухня, кузня, вяндлярня, вадакачка, гаспадарчыя пабудовы (2-я пал. XIX ст.); рэшткі парка)

11. **Крупеніна** (база адпачынку)

12. **Марцінова** (царква Аляксандра Неўскага / Пакроўская?, закінутая)

13. **Узрэчча** (вайсковыя могілкі, сярод 111 пахаваных салдат – 8 Герояў Савецкага Саюза: Дж. Асаналіеў, І.С. Бірукоў, М.С. Дароўскі, А.М. Звераў, І.А. Мартынаў, І.А. Плякін, У.Д. Салончанка, М.П. Хваткоў)

14. **Ула** (Траецкая царква; Траецкі касцёл; брацкая магіла савецкіх воінаў, сярод якіх 3 Героі Савецкага Саюза: Р.Я. Бераснеў, І.М. Бярэзін,



Рэпазіторый ВДУ

М.І. Мітрафанаў; радзіма мастака І. Хруцкага; месца заканчэння "марша смерці" (растрэла зняволеных Беразвецкай турмы супрацоўнікамі НКУС)

15. **Санікі** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, сярод пахаваны 4 Героя Савецкага Саюза: М.Д. Вяснін; А.Т. Маслікаў, Б.Я. Янтыміраў, М.Г. Гелавані); радзіма сав. гісторыка, акадэміка АН БССР Ц.С. Гарбунова)

16. **Свяча** (царква Раства Багародзіцы (1895)

17. **Слабодка** (Мікалаеўская царква, пач. ХХ ст.)

18. **Сокарава** (каменны крыж з надпісам ў памяць пра 200 жаўнераў, якія пахаваны там у 1569 г.; сядзібны дом, к. ХІХ ст.)

19. **Стрыжава** (сярэдявечны горад, які цяпер з'яўляецца вёскай)

20. **Хоціна** (радзіма генерала Л. Даватара, помнік Л. Даватару)

Найбольш <u>перспектыўны маршрут</u> па краі: Астроўна – Будзілава – Саннікі – Бешанковічы – Свяча – Дабрыгоры – Двор-Нізгалава – Бачэйкава – Хоціна – Ула – Узрэчча

## <u>Гарадок і Гарадоцкі раён</u>

1. **Гарадок** (краязнаўчы музей; валун з памятнай шыльдай у гонар паэмы "Тарас на Парнасе"; замчышча; помнік "Тарасу на Парнасе"; будынак былой аптэкі; забудова вуліцы былога яўрэйскага мястэчка; помнік вызваліцелям; танк ІС-2; мемарыял знішчаным вёскам; месца загубы мірных жыхароў у 1941–1943 гг. на Вараб'ёвых гарах; будынак былой паштовай станцыі; участак старадаўняй брукаванай дарогі; яўрэйскія могілкі; цэнтр рамяства "гарадоцкая кераміка"; алея ліхтароў; святая крыніца; дубы-волаты; лыжа-ролерная траса; азёры і археалагічныя стаянкі каля іх)

2. **Астраўляны** (радзіма К. Вераніцына, аўтара паэмы "Тарас на Парнасе")

3. **Бычыха** (памятная шыльда ў гонар знішчэння партызанамі фашысцкага гарнізона ў ліпені 1942 г.; помнікі на месцы гібелі Герояў Савецкага Саюза І.М. Антонава і М.М. Рудыка; Храм Анастасіі Узвырашальніцы; радзіма А.П. Асіціс (Ганчаровай); Цэнтр суправаджаемага пражывання пажылых грамадзян "Дом Міласэрнасці"; Святы калодзеж; "Трапа кахання"; Духоўныя багацці Бычыхінскай зямлі: "Бычыхінскі вясельны марш")

4. **Вышадкі** (гарадзішча на паўвыспе; курганны могільнік – больш 200 курганоў)

5. **Вялікія Стайкі** (былы бровар (знішчаны летам 2013); фрагмены парка; возера)

6. **Дарахі** (4 стаянкі паўночна-беларускай культуры; 11 курганных могільнікаў – самы вялікі некропаль у Беларусі; "Х.." лес; воз. Сенніца; месца нараджэння І.А. Вашчылы – поўнага Георгіеўскага кавалера ў 16 год.

7. **Дубраўкі** (вайсковыя могілкі і помнік – бронемашына; каменныя крыжы XIV–XIX ст.)

8. **Жукава** (Святая крыніца)

9. **Залучча** (геалагічны помнік прыроды Вялікі камень Залуцкі)

10. **Езярышча** і наваколлі (помнік на магіле С.П. Хайдукова – танк Т-70; мытня; абразія берага; валуны на беразе возера; фэст; р. Обаль)

11. **Кабішча** (вадасховішча і гідратэхнічныя збудаванні, Праабражэнская царква (пач. XX ст., псеўдарускі)

12. **Кісялі** (старажытнае паселішча і гарадзішча "Прыстань"; геалагічны помнік "Даліна р. Обаль – Полацкая нізіна"; месца пахавання філантропа і асветніка XIX ст., палкоўніка Карпава)

13. Ключагорская ГЭС (былая, на р. Обаль)

14. **Кузьміно** (паштовая станцыя (1-я пал. XIX ст.)

15. **Малашанкі** (помнік вызваліцелям, святая крыніца)

16. **Марыямпаль** ("Напалеонаўская дарога")

17. **Марчанкі** (гарадзішча ранняга жалезнага века "Жажуліца")

18. **Мехавое** (воінскі мемарыял; цэнтр былога раёна; помнікі духоўнасці (жалейка, музычнае мастацтва; фільм "Прощание с Меховым")

19. **Мяжа** (паселішчы мезаліту, неаліту, бронзы. Прыклад духоўнай культуры: прымаўка: "За Мяжу у Зайкава")

20. **Мястэчка** (замчышча; курганы (сопкі); месца былой сядзібы Аляксандра Вюртэнбергскага (брат імператрыцы Марыі Фёдараўны, беларускі генерал-губернатар (1811–1822), дзядзя Аляксандра I); самы вялікі вяз у краіне; група камянёў вялікіх памераў з незвычайнымі формамі, верагоднае капішча)

21. **Новы Болецк** (племянны і сакральны цэнтр к. X ст. (гарадзішча "Папова гара", "Буракова гара"; камень з антрапаморфнай выявай; камень са свастыкай)

22. **Ноўка** (былое мястэчка, месца былога шклозавода, аднаго са значных у Расійскай імперыі)

23. **Паташня** (былая латышская калонія; будынкі школы, латышскага сходу)

24. **Прудок** (база захоўвання і пераапрацоўкі боепрыпасаў; былы вадзяны млын; помнік вызваліцелям; лес Верцея; воз. Кашо – месца гнездавання гогаля)

25. **Пруднікі** (дуб-волат; заказнік "Дубрава"; святая крыніца; турбаза "Лосвіда"; р. Чарнічка)

26. **Рамні** (былы касцёл, драўляны, 1896, перабудоўваецца ў царкву)

27. **Сурміно** (гідралагічны заказнік "Сурміно"; воз. Белае і Чорнае; месца размяшчэння ў 1944 г. штаба 1-га Прыбалтыйскага фронту)

28. **Халамер'е** (брацкія магілы савецкіх салдат і партызан; помнік землякам і ў гонар 4-й Беларускай партызанскай брыгады; месца жыцця і практыкі вядомага мануальнага тэрапеўта М.А. Самарына)

29. **Хвошна** (Узнясенская царква, пач. XIX ст.)

*Магчымыя асобныя маршруты*: "Да горада-прывіда Гарцслаў"; "Латышы ў Беларусі" (Паташня); "На Беларускі Байкал" (воз. Вымна, в.

Репозиторий ВГУ

Кабішча: царква Узнясення, Канашы); "Да зарасцяў вадзянога арэха на азёрах Цёста і Медзесна"

## Дубровенскі раён

1. **Дуброўна** (музей; былы кляштар бернардзінцаў (пач. XIX ст., барока); Свята-Троіцкая царква (1809 г.); капліца Барыса і Глеба (2-я пал. XIX ст.); будынак былой суконнай мануфактуры (1-я пал. XIX ст.); яўрэйскія могілкі; помнік вызваліцелям; месцы жорсткіх баёў 1943–1944 гг.; крыніца ў Кірэевай рошчы ў Гутавым ірву (16 м глыбінёй); незвычайныя камяні ў Гутавым ірву, каля крыніцы; месца, дзе ў 1784 г. была пабудавана першая ў Расіі гадзіннікавая і пазументная мануфактуры (збудаваў Г. Пацёмкін; Месца нараджэння выдатнага земляка А.І. Казарскага)

2. **Асінторф** (помнік савецкім воінам, партызанам, падпольшчыкам і землякам)

3. **Буда** (помнік Асінторфаўскім падпольшчыкам; помнік Ю. Смірнову)

4. **Быстрыёўка** (дуб-волат, вышыня 17 м, даўжыня абкружнасці 7,5 м)

5. **Вежкі** (гарадзішча на правым беразе р. Рассаенкі. Класічны выгляд, добра праглядаецца, зручна для экскурсій, назіранняў і даследаванняў)

6. **Ланенка** (Пакроўская царква, пач. XX ст.)

7. **Ляды** (памятны знак ў гонар падзей 1812 г.; яўрэйскія могілкі; месца жыцця З. Шнэерсона; радзіма мастака С. Заранкі (1818–1870)

8. **Макараўка** (культавы камень; каменныя крыжы)

9. **Рыленкі** (мемарыяльны комплекс "Рыленкі" (1973 г., арх. Рыжанаў і М. Ткачук) (месцы жорсткіх баёў 1943–1944 гг.) пахаваны 10 тыс. салдат)

10. **Станіслававова** (будынак былога бровара, гаспадарчыя пабудовы; парк (XIX ст.)

*Духоўная культура*

11. Фестываль песні і музыкі "Дняпроўскія галасы ў Дуброўна". Праводзіцца з 1993 г. у другой палове чэрвеня.

12. Цэнтр рамяства "Дубровенская кераміка"

13. У выданні "Каласы пад сярпом тваім", Дубровеншчына – цэнтр апавядання. Гістарычныя постаці Дубровеншчыны выведзены як героі рамана: Вежа (князь Любамірскі), Кроер, павятовая шляхта. Легенда пра помсту кн. Ксаверыя Любамірскага манахам, павянчаўшым ягоную дачку Клемянціну; учынкі памешчыка Кроера. Упершыню згаданы ў выданні "Жывапісная Расія"

## Верхнядзвінскі раён

1. **Верхнядзвінск** (Мікалаеўская царква (1819, класіцызм); касцёл Раства Дзевы Марыі (1809, класіцызм); прыклады грамадзянскай забудовы: будынак (пач. XX ст.), будынак райвыканкама; будынак краязнаўчага музея (будынак былога суда); вакзал (1871); абеліск у гонар падзей вайны 1812 г.; "Дрыскі лагер" – знаходзіўся насупраць г. Верхнядзвінска;

Репозиторий ВГУ

мемарыяльны комплекс ахвярам фашызму, воінам-вызваліцелям і землякам; радзіма Аскназія Ісаака Львовіча (1856–1903), рускі і беларускі мастак, акадэмік жывапісу; дэндрарый (заснаваў В.Я. Паўлючкоў у 1982 г., вырастае 320 відаў дрэваў і кустарнікаў); цэнтр рамяства “дрысенскае ткацтва”; ДОТы “лініі Сталіна”; Дзвіна: каля Верхнядзвінска пры пасля таяння ледавіка пры спуску Полацкага правозера воды прарэзалі марэнныя наносы і утварылі даліну ракі, Лысую гару, тэрыторыя якой ўключана ў ландшафтны заказнік; самы вялкі востраў на Дзвіне – Другі востраў – 2 км., на ім ёсць свае лясы, лугі, ягаднікі)

2. **Азернікі** (цэнтр рамяства – лозапляценне)

3. **Асвея** (былы манастырскі шпіталь (1759, барока); парк (XVIII ст.); возера, востраў, ландшафтны заказнік)

4. **Бароўка** (Свята-Ефрасіннеўская царква (1844)

5. **Баліны** (каталіцкая капліца, у памежнай зоне)

6. **Барсукі** (валун “Хараброўскі камень”, каменны крыж)

7. **Бігосава** (чыгуначны вакзал (1924–1926, мадэрн)

8. **Валынцы** (будынак былой яўрэйскай школы, забудова к. XIX ст.; месца знаходжання Забельскага калегіўма пры дамініканскім кляштары (1786–1811), тэатра, жыцця і дзейнасці фізіка Фелікса Цяцерскага, мемуарыста Фаўстына Цяцерскага; школьны музей географа І.Д. Чэрскага)

9. **Вопытная** (фрагменты былой сядзібы Нітаслаўскіх)

10. **Дзернавічы** (рэшткі гаспадарчых пабудоў былой сядзібы )

11. **Каханавічы** (радзіма і месца пахавання бел. фальклярыста, паэта Ігната Храпавіцкага (1817–1893); клуб “Белыя вароны”; крыніца “Святы ключ”)

12. **Лісна** (заказнік, возера Лісна)

13. **Прошкі** (курган Дружбы, на мяжы трох краін – РФ, Латвіі, РБ. 3 алеі – у бок Беларусі – бярозавая, Расіі – кляновая, Латвіі – ліпы, на кургане – дуб, як сімвал непарушнай дружбы краін)

14. раз’езд Беніслаўскага (месца 4.08. 1942 г. быў знішчаны 110 м. мост, рух спынены на 16 сутак (да гэтага 60 эшэлонаў у суткі)

15. **Росіца** (Траецкі касцёл (пач. XX ст., неаготыка); росіцкія пакутнікі Антоній Ляшчэвіч і Юрый Кашыра; ледавіковая даліна і ланцуг азёр у ёй)

16. **Сар’я** (Свята-Успенская царква, збудавана як касцёл (1852–1857, адзін з найбольш яскравых помнікаў неаготыкі ў краіне) цяпер праваслаўны храм; фрагменты парка Лапацінскіх (XIX ст., экзоты – хвоя веймутава; падвясны масток, 2014); прыродны комплекс ракі Сар’янкі (даліна, раднікі, парогі, абрывы, лясы)

17. **Свольна** (Свальнянская дуброва; радзіма выдатнага даследчыка Сібіры Івана Чэрскага (1845–1892)

18. **Хараброва** (Вялікі камень, знаходзіцца на правым беразе Дзвіны каля вёскі. Вышыня 2 м, вага 200 т)

19. **Чурылава** (рэшткі Праабражэнскай царквы, у памежнай зоне)

Репозиторий ВГУ

20. **Юсціянава** (дуб-волат. Вышыня 28 м, узрост 400 г. адзін з найвялікшых у краіне; самы высокі ў Беларусі мост, вышыня 20 м, шырыня перамычкі паміж берагамі 280 м.

21. **Яніна** (мемарыял Памяці ў гонар 426 вёсак, спаленых у Асвейскім раёне ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Больш 300 з іх былі спалены разам з жыхарамі, 186 не адрадзіліся)

## <u>Орша і Аршанскі раён</u>

1. **Орша** (Будынак чыгуначнага вакзала (1912 г., 1930–1950 гг.);
<u>Культавыя помнікі</u>: рэшткі падмуркаў (адноўлена ў 2008) царквы Раства Багародзіцы (1661); Ільінская царква (1880); касцёл Св. Іосіфа (1819); Свята-Багаяўленскі Куцеінскі мужчынскі манастыр: Свята-Траецкая царква, Святадухаўская царква, жылы корпус (XVII ст.), месца жыцця і дзейнасці друкара, асветніка Спірыдона Собаля; жылы корпус былога трынітарскага кляштара (1714–1717); комплекс былога езуіцкага калегіума (XVII ст., барока); жылы корпус былога манастыра базыльян (2-я пал. XVIII ст.); будынак былога вадзяного млына (1902);
<u>Помнікі</u>: Мемарыяльны комплекс “Кацюша”; помнік К.С. Заслонаву; магіла К. Заслонава; Ул. Караткевічу; паркавая скульптура ў дзіцячым парку)

2. **Межава** (царква ў імя Пакрава Прасвятой Багародзіцы (1886); сядзібны дом і парк (1901); будынкі былога бровара, спіртасховішча, каменны крыж (у 2004 г. перавезены з в. Пількавічы Сенненскага раёна), руіны былой Пакроўскай царквы, 1886)

3. **Кабыляцкі парог** (Кабыляцкая гара – Аршанскія Курапаты, месца растрэлаў “ворагаў народа” у 1933–1937 гг.)

4. **Арэхаўск** (Спаская царква (першая пал. XIX ст.); магіла Героя Савецкага Саюза Ю.В. Смірнова; Будынак “БелДРЭС” – першая на Беларусі электрастанцыя, пабудаваня па плану ГОЭЛРО (1927–1930), помнік першай пяцігодцы (1930)

5. **Балбасава** (стэла вайсковай славы; помнік дальняй авіяцыі: самалёт Ту-16; помнік двойчы Герою Савецкага Саюза С.І. Грыцаўцу (1909–1939); месца базіравання 402 ТБАП (авіяполк цяжкіх бамбардыроўшчыкаў – стратэгічнай авіяцыі; былая ядзерная база; аэрадром мог прымаць любы лятаючы апарат)

6. **Барань** (будынак былой багадзельні (1905), радзіма бел. сав. пісьменніка Ул. Корбана)

7. **Бераснёва** (былая сядзіба: сядзібны дом, флігель, гаспадарчыя пабудовы, фрагменты парка)

8. **Браздзетчына** (Свята-Петрапаўлаўская царква (1875); школьны музей)

9. **Высокае** (Ільінская царква (1917); сядзіба (эклектыка, мяжа XIX–XX ст.), парк; месца правядзення I з’езда КПЗБ (25.06–25.07. 1928); помнік вызваліцелям)



Репозиторий ВГУ

10. Вял. **Міцькаўшчына** (замчышча XIV–XVIII ст.)

11. **Грышаны** (паштовая станцыя ўзору 1842 г.; скульптура жанчыны-механізатара (1950-я гг.)

12. **Забалацце** (сядзіба Дышлеўскіх (пач. XX ст.): службовы дом)

13. **Засценкі** (будынак былой паштовай станцыі, сяр. XIX ст.)

14. **Копысь** (гарадзішча і замчышча "Пятроўскі вал"; селішча пасадскае; капліца 1-й пал. XIX ст.; магіла ахвяр фашызму; цэнтр рамяства "Копыская кафля"; радзіма Максімава Ігнація (майстр XVII ст., вывезены маскоўскім партрыярхам Ніканам ў Валдайскі Іверскі манастыр, дзе наладзіў упершыню ў Масковіі вытворчасць паліхромнай кафлі)

15. **Крапіўна** (Прачысценская (Аляксандра Неўскага) царква (2-я пал. XIX ст.); месца Аршанскай бітвы (8.09. 1514 г.)

16. **Ламачына** (капліца на могілках, драўляная)

17. **Ларынаўка** (пячоры)

18. "**Ляўкі**" (мясціны жыцця і творчасці Янкі Купалы; мемарыяльны запаведнік Я. Купалы: дом Я. Купалы, дом шафёра, лазня, гаспадарчыя пабудовы, помнік Я. Купалу, музей; гарадзішча)

19. **Пішчалава** (сядзіба (XIX ст., драўляная); месца, дзе быў дадзены першы залп рэактыўных мінамётаў "Кацюша"; парк; каменныя крыжы)

20. **Роскі Сялец** (радзіма А.М. Косінца, старшыні віцебскага аблвыканкама, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта)

21. **Смаляны** (Руіны замка "Белы Ковель" (першая чвэрць XVII ст.); Аляксееўская царква (рэшткі, псеўдарускі, 1864); Спаса-Праабражэнская царква (другая палова XVIII ст.); рэшткі былога дамініканскага касцёла (позняе барока, другая пал. XVIII ст.); сядзібны дом (пач. XX ст., драўляны); магіла Тамаша Зана (паэт-рамантык, кіраўнік таварыства "філаматаў" і "філарэтаў")

22. **Стахаўка** (магіла рускага генерала М. Трухачова (1784–1850)

23. **Чырвоная Харкаўка** (паклонныя валуны: Апякун, Званец)

24. **Чэрвіна** (чыгуначныя казармы, лядоўня)

25. **Юрцава** (сядзіба Любамірскіх, 2-я пал. XIX ст.)

## Лёзненскі раён

1. **Лёзна** (гісторыка-краязнаўчы музей; помнік вызваліцелям і танк Т-34); будынак Дома культуры (сталінскі ампір), на месцы, дзе быў дом продкаў М. Шагала; дэндрапарк Лёзненскага лясгаса; чыгуначны вакзал)

2. **Адаменкі** (рэшткі былой сядзібы (сядзібны дом (амаль разбураны), гаспадарчая пабудова)

3. **Бабінавічы** (цэнтр ганчарнага рамяства "Бабінавіцкая кераміка"; археалагічныя помнікі; помнік духоўнай культуры – герб мястэчка; у Бабінавіцкая паляўнічай гаспадарцы абітае другая па велічыні папуляцыя мядзведзя; адзінае ў Беларусі месца пражывання вавёркі-лецягі)

4. **Выдрэя** (радзіма выдатнага земляка Вальдэмара Озалса; помнік



Рэпазіторый ВДУ

духоўнай культуры: абрад “Жаніцьба коміна”)

5. **Горшава** (найвышэйшая кропка Віцебшчыны)

6. **Дабрамыслі** (будынак ГЭС, помнік прамысловай архітэктуры)

7. **Завольша** (паштовая станцыя сяр. XIX ст.; месца, звязанае з М. Шагалам)

8. **Калышкі** (былое мястэчка; радзіма Яўхіма Фаміна, аднаго з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці ў 1941 г.)

9. **Крынкі** (гаспадарчыя пабудовы сядзібы роду Гуркаў; помнік Герою Савецкага Саюза Марыі Акцябрскай; помнік М. Лынькову; першы ў БССР помнік У.І. Леніну; 2 музеі ў Крынкаўскай СШ: “Баявой і працоўнай славы” і “Мемарыяльны музей Міхася Лынькова”; мемарыял у гонар воінаў-артылерыстаў)

10. **Пагосцішча** (мемарыяльны крыж у гонар паўстанцаў 1863–1864 гг.)

11. **Станіслававова** (рэшткі сядзібы, гаспадарчыя пабудовы)

12. **Уна** (паштовая станцыя; месца, дзе была збудавана і працавала першая ў Расійскай імперыі запалкавая фабрыка (1863–1885)

## <u>Лепельскі раён</u>

1. **Лепель** (царква ў імя Святой Параскевы Пятніцы (1868); Свята-Георгіеўская царква (на могілках, 1900); Касцёл Святога Казіміра (1876); будынак былога вінаачышчальнага склада (1897); будынкі грамадзянскай архітэктуры пач. XX ст.: прысутнае месца, турма, вузел сувязі, гандлёвыя рады; будынак Лепельскай ГЭС (1954); помнік духоўнай культуры – *лепельскі строй*

2. **Аношкі** (традыцыі; народная творчасць)

3. **Бароўка** (ваенны санаторый)

4. **Бярэзінскі запаведнік** (Домжарыцы – музей прыроды, вальеры; Бярэзінская водная сістэма – помнік гідратэхнічнага будаўніцтва)

5. **Валасовічы** (курганы, але далёка ад вёскі)

6. **Ворань** (паселішча-1, паселішча-2 перыяду позняга неаліту; гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку; селішча VI–VIII, IX–XI ст.)

7. **Губіна** (рэшткі касцёла (1714)

8. **Завідзічы** (месца жыцця археолага Міхаіла Кусцінскага (XIX ст.)

9. **Зялёны востраў** (будынак млына, драўляны, цяпер тартак)

10. **Макараўшчына** (Свята-Мікалаеўская царква (1886)

11. **Межыца** (сядзібны дом Здраеўскіх, XIX ст.)

12. **Окана** (“Дрэва шчасця” (хвоя, раздвоеная ад караня); гняздоўе папуляцыі шэрай чаплі)

13. **Поўсвіж** (аграсядзіба Шкіндзера: калекцыя старажытнасцяў, прыклад добраўпарадкавання тэрыторыі)

14. **Тадуліна** (дуб-волат, вышыня 26 м, узрост 250–400 гадоў)

15. **Таронковічы** (будынак былога спіртзавода/бровара (к. XIX ст.); сярэднявечныя могілкі і каменныя крыжы на іх; вялізны камень (4 м)

Репозиторий ВГУ

16. **Стары Лепель** (гарадзішча, селішча, замчышча; на паўвыспе, каменныя крыжы, вельмі жывапіснае месца)

17. **Суша** (замчышча Суша, былая крэпасць XVI ст.)

18. **Юшкі** (гарадзішча, курганы)

## <u>Полацк і Полацкі раён</u>

1. **Полацк** (<u>Помнікі культавай архітэктуры</u>: Сафійскі сабор (1044–1066; 1738–1750); Спаса-Праабражэнская царква (Ефрасіньеўская) царква (XII ст.); былая лютэранская кірха (XIX ст.); касцёл Св. Андрэя Баболі; <u>Помнікі археалогіі</u>: Барысаў камень (XII ст.); селішча, гарадзішча, Верхні замак (X–XIII ст.); Ніжні замак з валам Івана Грознага (XVI ст.); Запалоцкі пасад (X ст.); тэрыторыя былога Бельчыцкага (Барысаглебскага) манастыра (XII ст.); <u>Гістарычная забудова</u>: вул. Войкава; вул. Леніна, пр-т. К. Маркса/Ф. Скарыны, вул. Еўфрасінні Полацкай, вул. Сакка і Ванцэцці; вул. Ф. Скарыны; <u>Архітэктурная ансамблі</u>: 1. плошчы Свабоды (былая Парадная, Корпусная) (праезд Замкавы 2а, К. Маркса): будынак павятовага і ніжняга земскага судоў, дом віцэ-губернатара; дом каменданта; будынак магістрата; дом губернатара; Верхнія і Ніжнія ўправы; дом генерал-губернатара; 2. Комплекс былога езуіцкага калегіума (кадэцкага корпуса) (XVIII ст., 1830-я гг.); 3. Комплекс былога кляштара бернардзінцаў: кляштарны корпус, руіны касцёла Дзевы Марыі, будынак пякарні, гаспадарчая пабудова (1758, вул. імя 23 Гвардзейцаў); 4. Корпус былога кляштара францысканцаў (XVIII ст., вул. Леніна, 20); 5. Ансамбль Богаяўленскага манастыра: Богаяўленская царква, манастырскі корпус (XVIII ст.); 6. Ансамбль Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра: Спаса-Праабражэнская царква; роспісы ў інтэр'еры, цёплая царква, Крыжаўзвіжанская царква, манастырскія корпусы (пач. XVIII і пач. XX ст.), брама-званіца; будынак былой вадацяжнай вежы; "Домік Пятра I"; <u>Помнікі</u>: Ф. Скарыне (1974); В.М. Азіну (1979); Усяславу Чарадзею; Сімяону Полацкаму; Ефрасінні Полацкай; "23 гвардзейцам"; курган Бессмяротнасці; "Ў" (у нескладоваму); Цэнтру Еўропы; полацкаму купцу; князю Андрэю Полацкаму; У.І. Леніну; дзяцінству; журавы на чыгуначным вакзале; <u>Радзіма:</u> Сімяона Полацкага; К. Касовіча; С. Сахарава (этнограф, фалькларыст); Ю. Тарыча; Магіла Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай-Марчанка; <u>Памятныя месцы</u>: Дуб Вацлава Ластоўскага; былая "Сталіца" ордэна "Таварыства Езуса" (1772–1814); 13 музееў (у тым ліку 2 прыватных).

2. **Наваполацк** (Музей гісторыі горада; Помнікі першым будаўнікам горада ("Першая палатка"); А.С. Пушкіну (каля бібліятэкі А.С. Пушкіна); "Трубач"; "Журавушкі"; воінам-афганцам; курган працоўнай славы; гармата (дар палачан навапалачанам з нагоды 50-годдзя горада); фантаны з скульптурамі; прадпрыемствы "Нафтан" – адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў Беларусі, "Палімір"). Іншае: адзін з двух гарадоў



Рэпазітарый ВДУ

Беларусі, дзе няма помніка Леніну У.І.; Наваполацк – адзін з 4-х гарадоў Беларусі, дзе ёсць трамвай; прыватны музей “Савецкай рэчаіснасці”)

## Полацкі раён

3. **Бікульнічы** (воз. Янова – “беларускі Стоўнхэндж”)

4. **Блізніца** (сядзіба “Варанец”; сядзібны дом, гасп. пабудовы; былы млын)

5. **Быкаўшчына** (сядзіба Паклеўскіх-Козелаў: жылы двухпавярховы драўляны дом, флігель, гаспадарчыя пабудовы, падземная частка фамільнага склепа, парк, ставы, алеі)

6. **Бяздзедавічы** (комплекс былой сядзібы Аляксандра А. Рымскага-Корсакава, сваяка вядомага кампазітара Мікалая Рымскага-Корсакава: сядзібны дом, фрагменты парку, гаспадарчыя пабудовы; капліца Іверскай іконы Божай Маці (на могілках); царква (пач. XX ст.); каменны крыж)

7. **Ветрына** (ДОТы на лініі абарончых збудаванняў, т.зв. “лініі Сталіна”; касцёл бласл. Юрыя Матулевіча (1990); царква Стрэчання Гасподняга (былы клуб, 1990-я ); былы ваенны гарадок: пускавыя шахты ядзерных ракет)

8. **Двор-Гомель** (сядзіба, драўляная)

9. **Гомель** (мемарыял “Поле ратнай славы” – філіял Полацкага музея баявой славы (адноўлены фрагмент “лініі сталіна” з ДОТам, акопамі поўнага профіля); мемарыял у гонар партызанскай брыгады Дз. Цябута)

10. **Забалоцце** (непадалёк ад Ветрына, радзіма Ганны Баляславаўны Місуна (1868–1922) – першай жанчыны-геолага Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі. Захавалася сажалка, усталяваны памятны знак на камяні)

11. **Залессе** (непадалёк ад Ветрына (**Будзькаўшчына**), (радзіма выдатнага беларускага нацыянальнага дзеяча Б. Эпімах-Шыпілы)

12. **Захарнічы** (месца пахавання Івана Хруцкага (1810–1885), вядомага рускага і беларускага мастака. Месца, дзе была сядзіба Хруцкіх)

13. **Крумплева** (стаянка перыяду мезаліту 4–2-е тысяча-годдзі да н.э.)

14. **Калектыўная** (царква Св. Мікалая (кан. XVIII ст.)

15. **Казімірава** (будынкі)

16. **Лучна** (месца правядзення музычнага фестывалю “Рок-Кола”; Полацкая ГЭС)

17. **Малое Сітна** (замчышча XVI ст.)

18. **Нача** (рэшткі сядзібнага дому; памятны знак у гонар беларускіх пісьменнікаў: Вісарыёна Гарбука (1913–1986), якога называлі “беларускі Астроўскі”; Мікалая і Сцяпана Сямашкаў. Мікалай (1914–1941) загінуў пры абароне Воршы. Сцяпан (1898–1965), раманіст, журналіст)

19. **Туроўля** (замчышча на месцы каменнага замка Івана Грознага (XVI ст.)

## Расонскі раён

1. **Расоны** (Свята-Узнясенская царква (псеўдарускі, абкладзена бутавым камнем, 2-я пал. XIX ст.); былы сядзібны дом Гласко (псеўдаготыка, 1902);

Репозиторий ВГУ

рэштк парка; мемарыяльны комплекс у гонар падзей ваны 1941–1945 гг.; месца загубы савецкіх ваеннапалонных, партызан і мірных жыхароў; помнік вызвалення (57-мм гармата); Расонскі ідал (знойдзены ў р. Дрыса ў 2011 г.) – фэйк года!)

2. **Амосенкі** (гарадзішча (“класічнае”, з добра захаваўшыміся валамі, ірвамі), два селішчы, курганы)

3. **Горкі** (сядзіба (эклектыка, 1893)

4. **Двор Чарапіта** (рэшткі парка (пач. ХХ ст.)

5. **Забор’е** (фестываль сельскага турызму “Заборскі фэст”, аграсядзіба “У Крала”)

6. **Клясціцы** (месца бою 1812 г.; помнік у гонар перамогі рускіх войск (18–20.07. 1812 г. 17-тыс. рускі корпус пад камандаваннем Вітгенштэйна П.Х. нанёс паражэнне 29-і тыс. фр. корпусу маршала Удзіно; брацкая магіла сав. салдат (1941–1944)

7. **Кульнёва** (замчышча Сокал (XVI ст.), знаходзіцца ў сутоцы р. Дрыса і Нішча; помнік на месцы 1-га пахавання Я. Кульнёва)

8. **Межава** (5 гарадзішчаў; каменныя крыжы; курганы; радзіма бел. этнографа, фальклярыста А.А. Шлюбскага (1897–1941)

9. **Мурагі** (радзіма Яна Баршчэўскага (1794–1851), вядомага беларуска-польскага пісьменніка пач. ХІХ ст., аўтара кнігі “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”)

10. воз **Няшчэрда** (замчышча XVI ст., возера з самай вялікай берагавой лініяй у Беларусі)

11. **Перавоз** (гарадзішча Царкоўка ці гара Рагвалода і Рагнеды ці Рагнедзін курган; каменныя крыжы, паданні, апісаныя А.М. Семянтоўскім)

12. **Роўнае** (музей партызанскага побыту пад адкрытым небам (2002)

13. **Сакалішча** (гарадзішча; (помнік на месцы гібелі ў 1812 г. рускага генерала Я. Кульнёва)

14. **Сяляўшчына** (месца былога партызанскага аэрадрома)

15. **Янкавічы** (сядзіба і месца пахавання адмірала І.А. Павалішына; каменныя крыжы; верагодна, каменны ідал)

16. “**Сіньша**”, “**Чырвоны бор**” (заказнікі рэспубліканскага значэння; месца абітання мядзведзяў у жывой прыродзе; рыбалка, паляванне, збор грыбоў і ягад, аграсядзібы)

## <u>Сенненскі раён</u>

1. **Сянно** (адміністрацыйныя будынкі (пач. ХІХ ст.); будынак вучылішча к. ХІХ ст.; храм Св. Міколы Цудатворца (1990); капліца Святой Тройцы (драўляная, каталіцкая, 1990); радзіма бел. сав. паэта Алеся Жаўрука (А.Дз. Сінічкін); крыніцы Каплічка і Пяшчанка; помнік у гонар танкавай бітвы ў ліпені 1941 г.; помнік у гонар Матруны Маркевіч – аўтаркі нацыянальнага арнаменту на дзяржаўным беларускім сцягу; возера Сенненскае (легендарнае месца абітання цмокаў)



Репозиторий ВГУ

2. **Александрова** (самы вялікі дуб у раёне; вялікая хвоя)

3. **Багушэўск** (памятны знак і гармата ў гонар Сенненска-лепельскага контрудару 6–7.07. 1941 (адна з самых буйных танкавых бітваў Вялікай Айчыннай вайны); помнік савецкім воінам і партызанам; помнік лётчыкам А.Э. Марфіцкаму і А.А. Жураўлевічу, якія загінулі 30.08.2009 г. у Польшчы і коштам свайго жыцця выратавалі мірных жыхароў; памятная шыльда на будынку вакзала ў гонар лётчыка У.М. Гарбунова, які загінуў у 1944 г.; рэшткі парку; дом, у якім жыла народная артыстка БССР З.І. Канапелька; царква Пятра і Паўла; помпа ручная пажарная; помнік Герою Савецкага Саюза А. Гараўцу (“Крыло бессмяротнасці”); “трактар-легенда” (ХТЗ 1932 года выпуску), знаходзіцца на тэрыторыі былога саўгаса “Багушэўскі” на вул. Калхозная; дом-інтэрнат “Рабцава” для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця; абласная турбекулёзная бальніца; ГЛХУ “Багушэўскі лясгас”; памятны знак ва ўшанаванне растраляных у 1942 г. яўрэяў і славян; яўрэйскія могілкі; месца, дзе пражывала калонія кітайцаў; возера Серакаратня)

4. **Вароніна** (камень “Кравец”, другі па велічыні на Беларусі)

5. **Васількі** (вёска, жыхары якой былі ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга БССР № 1 за меліярацыю мясцовасці)

6. **Вялікі Азярэцк** (адзін з найбольшых курганных могільнікаў на Беларусі)

7. **Галоўск** (стаянкі перыяду позняга нэаліту – пач. бронзавага веку; Крывінскі тарфянік)

8. **Застадолле** (руіны Траецкай царквы (раней адносілася да в. Гасьмірава)

9. **Лугінавічы** (радзіма польскага паэта-рамантыка Тадэвуша Лады-Заблоцкага (1811–1847) паэма “Ваколіцы Віцебска”, элегіі “Да Дзвіны”, “Да Лучосы”)

10. **Обаль** (Прачысценская царква (драўлян., к. XIX ст., закінутая); навясны мост праз Абалянку)

11. **Машканы** (радзіма Героя Савецкага Саюза А.К. Гараўца (1915–1943) і помнік герою;  школьны музей; помнік Герою Савецкага Саюза, лётчыку І.Л. Камінскаму (1919–1974); самалёт Як-52, раней стаяў Як-18)

12. **Машчоны** (будынак былога вадзяного млына)

13. **Паграбёнка** (к. 1840-х гг., комплекс будынкаў былой паштовай станцыі: станцыйны дом, флігель для ямшчыкоў; хлеў; частка стайні; гумно)

14. **Рамшына** (будынак былой школы? (кан. XIX – пач. XX ст)

15. **Рыбакоўшчына** (радзіма Матруны Маркевіч, аўтара ўзора на сцягу БССР; “Шведскі вал” – зямельныя ўмацаванні па мяжы першага падзелу Рэчы Паспалітай)

16. **Скоградзіна**

18. **Утрылава** (ур. Купаваць), месца гібелі К. Заслонава (14.11. 1942 г.)

19. **Ходцы** (гаспадарчыя пабудовы сядзібы фон Рэнтэлей)

20. **Шыркі** (мемарыяльны знак на месцы дома, дзе нарадзіўся П.М. Машэраў)

<u>**Чашніцкі раён**</u>

1. **Чашнікі** (Праабражэнская царква (2-я пал. XIX ст.); помнік вызваліцелям; краязнаўчы музей)
2. **Новалукомль** (ДРЭС – флагман электраэнэргетыкі Рэспублікі Беларусь (праектная магутнасць 2400 МВт); музей электрастанцыі; возера Лукомскае – 5-е па плошчы, 2-е па аб'ёме вады на Беларусі)
3. **Белая Царква** (уладанне Сапегаў; рэшткі Траецкай царквы, мясцовая назва Белая царква, пач. XVI–XVII ст., ранняе барока, верагодны архітэктар – Арыстоцель Фіяраванці)
4. **Гогалеўка** (помнік прыроды і гісторыі і культуры – Змееў камень; крыніца)
5. **Іванск** (месца бітвы 1563 г.; рэшткі сядзібы Валдковічаў; музей у Іванскай СШ)
6. **Жэрына** (возера Жэрынскае і плаваючы востраў; лячэбныя гразі; крыніца “Ісус”)
7. **Кажары** (каменныя крыжы XIII–XVI ст.)
8. **Латыгалічы** (крыніца “Добрая вада”)
9. **Лукомль** (гарадзішча; селішчы; замчышча; курганы; былы цэнтр княства)
10. **Палітаддзел** (сядзіба (2-я пал. XIX ст.); рэшткі парка)
11. **Пачаевічы** (сыраварня сядзібы Храптовічаў; рэшткі Пакроўскай царквы)
12. **Цяпіна** (месца жыцця і дзейнасці асветніка Васіля Цяпінскага (Амельяновіча) (1540–1604)
13. **Чарэя** (царква Міхаіла Арханёла (1604?); прыклад грамадзянскай забудовы; сінагога (перароблена пад краму); яўрэйскія могілкі; былая сядзіба Мілашаў; рэшткі склепа на беразе возера; гарадзішча, помнік вызваліцелям)

<u>Славутыя землякі</u>: В. Цяпінскі, Р.Л. Рэлес, Мілашы, Ан-скі

**Ушацкі раён:** “Край азёр, лясоў, партызан і паэтаў”

1. **Ушачы** (касцёл Св. Лаўрэнція (1913); дзяржаўны музей народнай славы (1969); курганны могільнік перыяду ранняга сярэднявечча; былы вадзяны млын; радзіма Народнага пісьменніка Беларусі Р. Барадуліна)
2. **Арэхаўна** (сядзіба Грабніцкіх (1840-я гг., класіцызм); фрагменты парка; Свята-Параскевіцкая царква (1884)
3. **Бычкі** (радзіма Народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, музей-сядзіба сям'і В. Быкава)

Рэпазіторый ВДУ

4. **Загор'е** (вяночны двор – узор тыповай сялянскай пабудовы, пашыранай у паўночных раёнах Беларусі)

5. **Замошша** (будынак былога вадзяного млына, адноўлены)

6. **Мемарыяльны комплекс "Прарыў"** (7 км ад Ушачаў, паміж вв. Паперына, Плінава, Новае Сяло), прысвечаны трагічным падзеям прарыва нямецкай блакады вясной 1944 г.)

7. **Гарадок II** Лутаўскага с/с (не існуе) радзіма Р. Барадуліна

8. **Глыбачка** (злілася з Рукшэніцы) (магіла бел. паэта 2-й паловы XIX ст. Фелікса Тапчэўскага (Хвэлька з Рукшэніц)

9. **Кублічы** (радзіма А. Вярыга-Дарэўскага (псеўданім "Беларуская Дуда"), вядучы бел. пісьменнік 1850–1860-х гг., творы з цэнзуры не друкаваліся, аўтар унікальнага альбома; гарадзішча, курганы, брацкая магіла салдат і партызан; грамадзянская забудова)

10. **Мосар** (рэшткі Срэценскай царквы (былы касцёл, 2-я пал. XIX ст.)

11. **Пуцілкавічы** (радзіма краязнаўцы, археолага Ф. Вярэнькі (1862–1892); радзіма Народнага паэта Беларусі, галоўнага рэдактара выдавецтва "Беларуская савецкая энцыклапедыя" Пятруся Броўкі (1905–1980); помнік Алене Сцяпанаўне Броўка – маці народнага паэта Пятруся Броўкі, якая загінула ў Асвенцыме. Стэла знаходзіцца на месцы, дзе да вайны стаяла хата Броўкаў)

12. **Чарсцвяды** (радзіма празаіка, этнографа, публіцыста А. Пшчолкі (1869–1943)

13. **Селішча** (былы кляштар бернардзінцаў (барока, 1726–1734): касцёл Св. Веранікі; кляштарны корпус; курганны могільнік; каменныя крыжы)

14. **Старына** (радзіма бел. сав. паэтэсы Е. Лось (1929–1977), зборнікі вершаў "Сакавік", "Палачанка", "Яснавокія мальвы")

15. **Чарапоўшчына** (рэшткі сядзібы Маліноўскіх; верагоднае месца нараджэння В. Быкава; радзіма Маліноўскіх; мясціна, звязаная з жыццём і дзейнасцю Альгерда Маліноўскага, Антона Вівульскага, Віктара Валенціновіча, Віталіса Хамёнка, Уладыслава Дзявульскага, Васіля Быкава)

## Талачынскі раён

1. **Талачын** (комплекс былога манастыра базыльян (1769): царква (з 1804 г. праваслаўная Пакроўская царква); манастырскі будынак; фрагменты парку (закладзены ў кан. XIX ст. ); касцёл Св. Антонія (1853); былы бровар; масласырзавод, 1932); помнік вызваленіцелям; памятны знак у гонар пра першую згадку пра горад; алея герояў; радзіма мастака, Героя Беларусі М. Савіцкага; радзіма Ірвіна Берліна (Ізраіля Бейліна), аўтара песні "Божа, блаславі Амерыку", неафіцыйнага гімна ЗША; памежны слуп на былой мяжы РП і РІ)

2. **Абольцы** (тут быў пабудаваны першы касцёл ў ВКЛ (1387)

3. **Азярцы** (будынак былога бровара, 1906)



Репозиторий ВГУ

4. **Высокі Гарадзец** (радзіма Міхася Зарэцкага (1901–1941), бел. сав. пісьменнік Міхаіл Яўхімавіч Касянкоў. Раманы “Сцежкі-дарожкі”, “Вязьмо”)

5. **Галошава** (сядзіба Цюндзявіцкіх (1897); каменны крыж; батанічны заказнік; возера Глыбокае)

6. **Горшчаўшчына** (будынак былога бровара)

7. **Друцк** (гарадзішча; замчышча; “Друцкае Евангелле”; крыніца на замчышчы; “Друцкія палі” – месца збору войскаў ВКЛ у выпадку вайны; першая згадка ў 1078 г.)

8. **Заазер’е** (ветраны млын, 1990)

9. **Забайкал** (пейзажны парк, уладанне Гардзялкоўскіх)

10. **Звянячы** (воданапорная вежа (помнік індустрыяльнай архітэктуры) пабудавана У.Р. Шухіным, прататып радыёвежы ў Маскве на Шабалаўцы – сімвал СССР у 1930-я гг.)

11. **Зялёная** (цагляны верставы слуп)

12. **Коханава** (радзіма расійскага генерала арміі В.Г.Казанцава)

13. **Лесіна** (рэшткі сядзібы Рэнтгартэнаў: капліцы, лядоўня, амбар)

14. **Палявая** (Манастыр) (Свята-Успенская царква (1890); Барыса-Глебская крыніца; помнік лётчыку, двойчы Герою Савецкага Саюза С.П. Супруну (1907–1941), загінуў у паветраным баі каля вёскі, перапахаваны ў 1960 г. на Новадзявочых могілках у Маскве)

15. **Равучча** (капліца-пахавальня паноў Хамянтоўскіх (1882, захавалася часткова); былая сядзіба кн. Хамянтоўскіх)

16. **Рацава** (сядзіба Замойскіх: рэшткі гаспад. пабудоў (стайні, кузні); пейзажны парк (к. XIX ст.)

17. **Усвіж-Бук** (месца прамысловай распрацоўкі торфа; месца дзе знаходзіўся Рагвалодаў камень)

18. **Сані** (месца працы Я. Коласа ў якасці настаўніка. “Першы беларускі настаўнік, першай беларускай школы”)

19. **Скрыпуцёва** (Святая крыніца)

20. **Славені** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан; магіла лётчыка палка “Нармандыя” (з 28.11. 1944 “Нармандыя–Нёман”) Жака Гастона

21. **Слаўнае** (вадакачка, 1894)

22. **Хахлоўка** (будынак былога вадзяного млына)

23. **Юзэфполле** (пейзажны парк, уладанне Славінскіх)

24. **Ласкоўшчына** (цяпер Круглянскі раён), радзіма выдатнага рускага мастака М.В. Неўрава, аўтара карцін “Раман Галіцкі і папскія паслы”, “Эпізод з жыцця Пятра”, “Патрыярх Нікан перад судом”)

## <u>Шумілінскі раён</u>

1. **Шуміліна** (чыгуначны вакзал (1886), другі ў Беларусі; службовыя памяшканні пры чыгунцы; краязнаўчы музей; касцёл Маці Божай Фацімскай; радзіма Героя Савецкага Саюза П. Акуцыёнка; дзіцячы парк)

Репозиторий ВГУ

2. **Башні** (воз. Будавесць і заказнік Гародна)

3. **Гародна** (гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку)

4. **Горкі** (Чортаў/Вялікі камень – самы вялікі на Беларусі)

5. **Казяны** (замчышча ва ўрочышчы Красамай; рэспубліканскага ландшафтнага заказнік “Казянскі”; радзіма гісторыка і археографа Дз.І. Даўгялы (1868–1942)

6. Ключагорская ДРЭС

7. **Лескавічы** (рэшткі сядзібы Хлюдзінскіх (1912 г., архітэктар Б Скот); месца жыцця бласлаўлёнай Цаліны Бажэнцкай (Хлюдзінскай), заснавальніцы кангрэгацыі (ордэна) Сясцёр Уваскрасення; рэшткі парка; храм прападобнага Сергія Раданежскага (к. XIX ст., псеўдарускі стыль); мемарыяльная шыльда на школе ў гонар П.З. Калініна (кіраўніка БШПР у гады Вялікай Айчыннай вайны); воз. Лескавіцкае; зона адпачынку; экалагічная трапа; помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў; помнік У.І. Леніну)

8. **Лоўжа** (Святая крыніца)

9. **Мішневічы** (каменны крыж перыяду позняга сярэднявечча і хвоя; паданне пра крыж і хвою; ваенныя могілкі; САУ-152; будынак былога вадзяногa млына)

10. **Обаль** (былы сядзібна-паркавы комплекс Ю.Ю. Амбургера; музей “Патрыёты Обальшчыны” (1965); помнік у гонар обальскага камсамольскага падполля “Юныя мсціўцы” (Е. Зінькова, З. Партнова); радзіма акадэміка АН БССР (1929) С.М. Вышалескага (1874–1958), вучонага ў галіне эпізааталогіі; рака Обаль, адно з адгалінаванняў шляху з “варагаў у грэкі”)

11. **Пабеда** (Свята-Успенская царква (к. XIX ст., псеўдарускі) адносяць да в. Шпакоўшчына)

12. **Прыазёрны** (месцазнаходжання Шумілінскага ільнозавода; гемарфалагічны помнік прыроды “Шарава гара”; воз. Дабея; над тэрыторыяй пасёлка ў 1944 г. быў збіты самалёт Як-7 эскадрыллі “Нармандыя–Неман” з лётчыкам Бруна дэ Цьеры дэ Фальтана)

13. **Полцева** (гаспадарчыя пабудовы сядзібы Баршчэўскіх)

14. **Ужляціна (**радзіма свяшчэннамучаніка, пратаіерэя Віцебскага Мікалая Акаловіча (1863–1934)

15. **Слабада** (былая в. Казаногава) (Святая крыніца)

16. **Сураўні** (Святая крыніца)

17. **Тропіна** (ваенныя могілкі (пахаваны 1,5 тыс. салдат і афіцэраў, у тым ліку 4 Героі Савецкага Саюза)

## Браслаўскі раён

1. **Браслаў** (музейны комплекс; калодзежны шацёр; будынак былой бальніцы (1906); замчышча “Замкавая гара”; касцёл імя Раства Дзевы Марыі (1897, нэаготыка, дэкор храма выкананы ў тэхніцы “рызынкавай тынкоўцы”); цудадзейны абраз Маці Боскай Браслаўскай – Валадаркі



Репозиторий ВГУ

азёраў; Мікалаеўская царква (псеўдарускі стыль, 2-я пал. XIX ст.); грамадзянская забудова 30-х гг XX ст.)

2. **Ахрэмаўцы** (парк Бельмонт (2-я пал. XVIII – пач. XIX ст., 65 га, адзін з буйнейшых паркаў рэгулярна-пейзажнага тыпу планіроўкі); капліца Плятараў; цагляныя брамы і агароджа, косніца; драўляны будынак былой школы (1930-я гады); гісторыя графа Мануццы, якога называлі "д'яблам Поўначы")

3. **Барадзінічы** (касцёл Святога Юзэфа (1836)

4. **Богіна** (Пакроўская царква (кан. XIX ст., псеўдарускі)

5. **Буёўшчына** (царква стараверская (1930-я гг.)

6. **Буловішкі** (Пакроўская стараверская царква, памежная зона)

7. **Відзы** (Траецкі касцёл (1914, неаготыка, самы высокі касцёл на Беларусі); царква Успення Прасвятой Багародзіцы (1910); забудова міжваеннага часу; радзіма і месца пахавання Тамаша Ваўжэцкага, грамадска-палітычны дзеяч Польшчы, адзін з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г., сябра і калега Тадэвуша Касцюшкі. Пасля яго палону – быў прызначаны пераемнікам галоўнакамандуючага)

8. **Відзы-Лаўчынскія** (былая сядзіба Т. Ваўжэцкага: сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы, былы водны курорт; парк (кан. XVIII ст.)

9. **Гірэйшы** (могілкі салдат Першай сусветнай вайны, памежная зона)

10. **Друя** (ансамбль былога кляштара бернардзінцаў: касцёл імя Святой Тройцы, фрагмент дэкаратыўнай кампазіцыі ў галоўным алтары; жылы корпус, агароджа з брамай (1643–1646); парк (XVIII ст.); Дабравешчанская царква (XIX ст., закінутая); царква Св. Георгія (драўляная, XIX), рэшткі царквы Св. Пятра і Паўла (кан. XVIII ст.), стараверская царква (драўляная, пач. XX ст.); грамадзянская забудова; сінагога; месца бою 1812 г. (3.07. 1812 г. атрад ген. Я. Кульнёва разграміў брыгаду французскай конніцы); магіла ахвяр фашызму; Барысаў камень; мураваная сядзіба Сапегаў–Мілашаў (XVIII ст.); яўрэйскія могілкі XVIII–XIX ст.; радзіма юрыста, прафесара У.М. Беняшэвіча, які быў сябрам А. Эйнштэйна, наркомам гандлю СССР у 1930-я гг.; радзіма сав. і парт. дзеячкі Златы Лілінай; магіла палк. П.А. Шчытаміра-Сухазанета; мяжа Беларусі і Латвіі)

11. **Дрысвяты** (замчышча на востраве воз. Дрысвяты (XI–XVIII ст.); Петрапаўлаўская царква (1908); касцёл імя Св. Пятра і Паўла (1929); возера; выгляд на Ігналінскую АЭС)

12. **Далёкія** (касцёл Святога Станіслава)

13. **Даўблі** (дом упраўляючага былой сядзібы Плятараў (1856)

14. **Замошша** (Петрапаўлаўская царква, 1893)

15. **Злота** (цагляны дом, прыклад грамадзянскай забудовы пач. XX ст.)

16. **Іказнь** (замчышча (XVI–XVII ст.); Мікалаеўская царква (1905); брама; касцёл Маці Божай Ружанцовай (1912); вяночны двор (1909); будынак былога млына)



Репозиторий ВГУ

17. **Казьяны** (царква Св. Духа (1903, псеўдарускі, як у Лужасна), будынак былога млына, знаходзіцца ў памежнай зоне)

18. **Карасіна** (крыніца, знаходзіцца ў памежнай зоне)

19. **Кезікі** (гара “Маяк”, вельмі жывапісныя панарамы; аглядная пляцоўка, вышыня 174 м.; крыніца “Акмяніца”)

20. **Кірыліна** (стараверская Траецкая царква, знаходзіцца ў памежнай зоне)

21. **Мельнікі** (могілкі татарскія. Адзін з найбуйнейшых мізараў на Беларусі. У 3,5 км ад касцёла ў Відзах), знаходзіцца ў памежнай зоне)

22. **Мікалаюнцы** (стараверская царква Св. Мікалая, драўляная), знаходзіцца ў памежнай зоне)

23. **Мілюнцы** (часам прыпісваюць да в. Пеліканы, касцёл Св. Якуба, 1907)

24. **Мінкавічы** (касцёл Маці Боскай Анёльскай (пач. XX ст., драўляны); стараверская Пакроўская царква, пач. XX ст. )

25. **Мяжаны** (касцёл Маці Боскай Анёльскай)

26. **Маскавічы** (гарадзішча на беразе воз. Дзерба; па меркаванні некаторых археолагаў, другое па значнасці паселішча вікінгаў ва Усходняй Еўропе)

27. **Нурвянцы** (каталіцкая капліца, знаходзіцца ў памежнай зоне)

28. **Опса** (комплекс былой сядзібы Плятараў (1904); касцёл Нараджэння Св. Яна Хрысціцеля (пач. XX ст.)

29. **Плюсы** (касцёл імя Святой Тройцы (пач. XX ст., неаготыка, пабудаваны з бутавага каменю); плябанія, драўляны дом)

30. **Рацюнкі** (гарадзішча днепра-дзвінскай культуры; цікавая знаходка – фрагмент вырабу з косці з выявай чалавека з аднаго боку і конніка з другога)

31. **Слабодка** (касцёл імя Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса (1903, псеўдараманскі стыль); уваходныя дзверы (1903) – прыклад манументальна-дэкаратыўнага мастацтва і кавальскай майстэрства); інтэр’ер храма распісаны ў 1970-я гг. у незвычайным стылі)

32. **Старадворышча** (капліца Св. Ядзвігі, 1935)

33. **Струншчына** (магіла, дзе пахаваны сын М. Цвятаевай – Георгій Эфрон)

34. **Чэрнішкі** (камень “Каровін валун”, знаходзіцца ў памежнай зоне)

## <u>Глыбоцкі раён</u>

1. **Глыбокае**: <u>Помнікі архітэктуры</u>: Траецкі касцёл (1764–1782, 1902–1908 перабудаваны арх. Ю. Заро – барока, мадэрн); царква Раства Багародзіцы (пабудавана ў 1639–1654 гг. як касцёл кармелітаў), выдатны помнік стылю “віленскае барока” і комплекс былога кляштара кармелітаў: ўяздная брама, уваходныя дзверы, і дэкаратыўная галерэя, абнесеная металічнай рашоткай з арнаментам, якая над антабламентам па ўсім



Репозиторий ВГУ

перыметры будынка); будынак кляштара, агароджа; былы кляштар базыліянаў у *Беразвеччы* (арх. Г. Глаўбіц, 1756–1763, "віленскае" барока); забудова вул. Леніна (канец XIX – пачатак XX ст.); забудова вул. Маскоўскай: аўстэрыя XVIII ст.; Ільінская капліца на могілках (канец XVIII ст., класіцызм); мемарыяльная калона ў гонар Канстытуцыі 3 мая 1791 г.; магіла барона Мюнгхаузена; радзіма савецкага авіяканструктара П.В. Сухога; самалёт – Су 17 (на выездзе з горада); музей авіяканструктара П.І. Сухога (СШ № 1)

Помнікі: алея славутых землякоў (Я. Драздовіч, К. Буйніцкі, В. Ластоўскі, І. Перэльман, С. Корсак, А. Дубровіч); барону Мюнгхаўзену; "Дзеду-глыбачаніну"; мемарыяльная шыльда на плошчы 3 мая (17 верасня) у гонар славутага земляка Тадэвуша Даленгі-Мастовіча, аўтара кніг "Знахар", "Дзённікі пані Ганкі"; помнік воінам-афганцам (1998, скульптар Жбанаў)

Магілы ахвяр фашызму: брацкая магіла воінаў і партызан у парку Перамогі (138 салдат 43-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту і 3 партызаны); мемарыяльны знак прысвечаны глыбоцкім падпольшчыкам пад кіраўніцтвам Ю.А. Сабалеўскага і І.Ф. Лакоткі з восені 1941 г.; ур. Барок (пахаваны 27 тыс. савецкіх грамадзян, растраляных у 1942–1944 гг., магілы італьянскія салдат)

2. **Азярцы** (сядзіба (2-я пал. XIX ст., класіцызм), былы бровар; новы касцёл)

3. **Арэхаўна** (Глыбоцкі дэндралагічны сад)

4. **Бабруйшчына** (царква Іаана Прадцечы (1873), драўляны касцёл Св. Антонія (страчаны), былы вадзяны млын; каменны крыж; Святая крыніца і капліца над ёй)

5. **Барыскавічы** (сядзіба Дубашынскіх, XIX ст, дрэва)

6. **Бушыкі** (Пакроўская царква, 1860-я гг.)

7. **Верхняя** (Міхайлаўская царква, 1886 ці пач. XX ст., помнік драўлянага дойлідства)

8. **Галубічы** (гідралагічны заказнік "Галубіцкая пушча"; царква (был. в. *Папоўшчына*) стаіць у чыстым полі, не адзначана ў "Зборы", лічыцца Галубіцкай – Галубічы – на могілках каменныя крыжы.

9. **Гатаўшчына** (рэшткі былой сядзібы Бжаздоўскіх (1880-я гг.)

10. **Дзедзіна** (царква Раства Багародзіцы (1914)

11. **Дзеркаўшчына** (касцёл Узнясення Дзевы Марыі (1822, класічны)

12. **Доўгае** (самае глыбокае возера на Беларусі. Глыбіня 52 м. на беразе гідралагічны заказнік *Галубоў сад*.)

13. **Забор'е** (Мікалаеўская царква (пач. XX ст.)

14. **Забелле** (Крыжаўзвіжанская царква (пач. XX ст., драўляная)

15. **Завулак Рускі** (была в. Завулак Літоўскі) – радзіма маці Васіля Быкава)

16. **Загацце** (будынак чыгуначнай станцы (пач. XX ст)

Репозиторий ВГУ

17. **Задарожжа** (касцёл Дзевы Марыі (1910) – у в. Мнюта-2

18. **Залессе** (сядзібны дом маёнтка графа Моле, захаваліся будынкі стайні, гаспадарчы будынак, рэшткі парка)

19. **Зябкі** (млын (1920-я, мадэрн), пабудаваў Рафаіл Ітман. Тры паверхі, жоўтая цэгла, чарапіца, захаваліся гаспадарчыя пабудовы; чыгуначная станцыя)

20. **Івесь** (каменныя крыжы на могілках).

21. **Кавалі** (Успенская царква (1748) (былы касцёл кармелітаў – два нэфа), драўляная! – 100 м. геадэзічны знак *найвышэйшае месца Глыбоцкага раёна*)

22. **Канстанцінава** (Траецкі касцёл (кан. XX ст, званіца XIX, 1990-я гг.); сядзіба: сядзібны дом, флігель, пабудовы)

23. **Каралевічы** (магіла паэта Алеся Дубровіча (сапраўднае прозвішча Рэдзька), дзеяч нац.-вызваленчай барацьбы Зах. Беларусі)

24. **Кашталяншчына** (жылы дом і гаспадарчыя пабудовы сядзібы Быхаўцоў: амбар, стайня)

25. **Ластовічы** (Багаяўленская стараверская царква, 1876)

26. **Лаўрынаўка** (малельня старавераў)

27. **Ліпляні** (правільней **Малыя Давыдкі**) (магіла мастака Язэпа Драздовіча). Могілкі знаходзяцца на гары. Ад уваходу ідзем налева. На самым краю з усходняга боку)

28. **Мамаі** (царква (канец XVIII ст., класічны стыль), перарobленая з касцёла, брама і званіца; сядзіба)

29. **Мнюта**-2 (касцёл Дзевы Марыі (1910); был сядзібны дом (пач. XX ст., драўляны)

30. **Мосар** (касцёл Святой Ганны (1792, класічны); 10 сюжэтных барэльефаў у інтэр’еры касцёла (1792); культурна-дэндралагічны комплекс; месца жыцця святара Юзоаса Булькі; экзатычныя расліны; вальер для страусаў; “Крыжовы шлях”; антыалкагольны музей; алея цвярозасці; музей імя Ю. Булькі; памятны камень у гонар 500-годдзя вёскі; філіял гісторыка-этнаграфічнага музея)

31. **Падсвілле** (пліскі каменны крыж, умураваны ў камене каля касцёла; савецкі бровар)

32. **Празарокі** (касцёл Маці Боскай (пач. XX ст., неараманскі); Петрапаўлаўская царква (1909); месца нараджэння і помнік на магіле І. Буйніцкага (1861–1917), акцёра, рэжысёра, тэатральнага дзеяча, заснавальніка беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра; музей І. Буйніцкага ў Празароцкай СШ; карставыя пячоры каля воз. Гінькава Празароцкі с/с. 1 км уздоўж возера)

33. **Пліса** (каменны крыж (XIV–XVII ст.) перавезены ў Падсвілле, укапаны перад царквой; царква Параскевы Пятніцы (1887); грамадзянская забудова; яўрэйскія могілкі; турыстычны комплекс “Пліса”)

34. **Пратасы**-Кукроўскія (царква Узнясення (2-я пал. XIX ст.)

Рэпазіторый ВДУ

35. **Прошкава** (касцёл Святога Яна Хрысціцеля (кан. XIX ст., помнік драўлянага дойлідства) капліца Рафала. Помнік каменны, выраблены ў Вільні, Ераніму Дабашынскаму, дуб абсечаны. Сядзібны дом Дабашынскага, драўляны)

36. **Саннічкі** (сядзібны дом (кан. XIX ст., драўляны) каля воз. Гінькаўскае, пры дарозе Празарокі–Чарневічы)

37. **Сахновічы** (пячоры побач з Саннічкамі)

38. **Сасноўка** (камень Я. Драздовіча)

39. **Удзела** (касцёл францысканцаў (1740, 1847); касцёл Дзевы Марыі (1766–1791); брама-званіца; жылы корпус кляштара (1805); гаспадарчы корпус і пабудовы; батлейка; музейная экспазіцыя прысвечаная Максіміліяну Колбе; фестываль хрысціянскага кіно "Магніфікат")

40. **Шо** (возера – геаграфічны цэнтр Еўропы)

41. **Шэпелева** (будынак былога вадзянога млына)

42. **Чарневічы** (царква Параскевы Пятніцы (псеўдарускі, 1887); брама царкоўная, капліца пры царкве; касцёл Яна Хрысціцеля, 1920-я гг.)

43. **Амбросавічы** (татарскія могілкі)

Славутыя землякі: *Буйніцкі* Ігнат, заснавальнік першага беларускага прафесійнага тэатра, Язэп *Драздовіч*, мастак, археолаг, філосаф, "беларускі Леанарда да Вінчы"; *Даленга-Мастовіч* Тадэуш, польскі пісьменнік, сцэнарыст, рэжысёр ("Знахар"); Вацлаў *Ластоўскі*, акадэмік, гісторык, грамадска-палітычны дзеяч; Клаўдзій *Дуж-Душэўскі*, дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння; Павел *Сухі*, авіяканструктар

Помнікі прыроды: гідралагічны заказнік "Галубіцкая пушча", далучаецца да Бярэзінскага біясфернага запаведніка; батанічны заказнік "Халмагоры"; Глыбоцкі дэндрасад; карставыя пячоры каля воз. Гінькова Празароцкі с/с.

## Мёрскі раён

1. **Мёры** (раённы краязнаўчы музей; музейны комплекс СШ № 3 (гісторыка-краязнаўчы; кнігі; этнаграфічны; гісторыі адукацыі); набярэжная; Успенскі касцёл (1907); помнік ненароджанаму дзіцяці)

2. **Блошнікі** (сядзібы дом, драўляны)

3. **Дзісна** (самы маленькі горад краіны; замчышча; Уваскрасенская царква (1870), царква іконы Божай Маці Адзігітрыі (1904); званніца; паром праз Дзвіну; будынкі сінагогі, яўрэйскай бальніцы, гасцініцы "Рыга", прыклады грамадзянскай забудовы; павятовага аддзялення Дбання аб Цвярозасці; сядзіба Кастравіцкіх "Дарашковічы"; будынак народнага вучылішча; рэшткі касцёла Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі (1773); помнік духоўнай культуры – *дзісненская кераміка*)

4. **Дрыгучы** (сядзібны дом (кан. XIX ст., драўляны, закінуты)

5. **Забалоцце** (сядзіба Дмахоўскіх; радзіма скульптара, паўстанца Г. Дмахоўскага (удзельнік паўстанняў 1830–1831 гг., 1863–1864 гг., аўтар скульптур Т. Джэферсона, Т. Касцюшкі для Кангрэса ЗША, барэльефаў у



Репозиторий ВГУ

грабніцы Напалеона Банапарта, скульптурнай групы “Гарыбальдзі з воінамі”, бюста У. Сыракомлі)

6. **Лявонпаль** (фрагменты комплексу былой сядзібы Лапацінскіх: сядзібны дом, рэшткі флігеля, брамы з агароджай, фрагменты парку; Траецкая царква (1774–1782, драўляная); званіца; калона ў гонар Канстытуцыі 3 мая 1791 г.; школа 1930-я гг.; музей “Радзімазнаўства” С. Панізніка)

7. **Вята** (драўляны касцёл Яна Хрысціцеля (1939, драўляны, закінуты, у памежнай зоне)

8. **Галомысла** (царква Спаса-Нерукатворнага (сяр. XIX ст.)

9. **Дзедзіна** (сядзіба Рудніцкіх (1810–1820); Святая крыніца)

10. **Ідолта** (касцёл імя Божай Маці Шкаплернай з гары Кармель (1939); капліца-пахавальня Мілашаў (1862) на могілках; вадапад на месцы млына; рэшткі сядзібы Мілашаў (1873)

11. **Калінавая** (Мікалаеўская царква (другая палова XIX ст., дрэва)

12. **Камянполле** (сядзіба Мірскіх (пач. XX ст.): сядзібны дом, стайня)

13. **Красняне** (сядзібны дом кан. XIX – пач. XX ст.) між вв. Красняне і Субачова, на паўднёва-заходнім беразе воз. Бор)

14. **Кублішчына** (стараверская Свята-Траецкая царква (пач. XX ст., драўляная)

15. **Кухцінцы** (радзіма П. Мятлы, дзеяча нацыянальна-вызваленчага руху Зах. Беларусі)

16. **Навалока** (крыніца “Святая вада” у 5 км ад хутара)

17. **Малышава** (Петрапаўлаўская царква (1877)

18. **Междурэчча** (вадапад на Вяце)

19. **Ніўнікі** (Успенская стараверская царква (1906)

20. **Новы Пагост** (Касцёл Святой Тройцы (1766); званіца; Мікалаеўская царква (1879)

21. **Пераброддзе** (касцёл Сэрца Езуса (1933); царква Св. Георгія (1908–1911); герб вёскі – помнік духоўнай культуры)

22. **Стэфанова** (капліца каталіцкая Св. Арханёла Міхаіла, драўляная (1750)

23. **Узмёны** (Мікалаеўская царква (1882)

24. **Цвеціна** (Крыжаўзвіжанская царква (1864–1867)

25. **Чэрасы** (Мікалаеўская царква (1885–1886); жылы дом (кан. XIX – пач. XX ст.)

26. **Язна** (гарадзішча; Праабражэнская царква (канец XIX – пач. XX ст.); батанічны заказнік “Чыстая дуброва”; крыніца Святога Яна (8 км ад вёскі, свята на 19 жніўня); вялікі камень Язненскі талеркавы)

**Славутыя землякі**: Радзіма В. Ластоўскага, П. Мятлы, С. Панізьніка, П. Простага, І. Цітовіча, Г. Дмахоўскага.

**Сядзібы** Мёршчыны: Рудніцкіх **Дзедзіна** (1810–1820 г.); Мірскіх у **Камянполлі** (кан. XIX ст.), Мілашаў у **Ідолце**, Лапацінскіх у **Лявонпалі,** Дмахоўскіх у Забалоцці.

Рэпазіторый ВГУ

**Помнікі прыроды**: **А**. Гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння “Ельня” (1968). Плошча 25 тыс. га. Мэта – захаванне унікальнага балотнага масіва з элементамі тундравых ландшафтаў і комплексам рэдкіх і знікаючых відаў раслін [самае вялікае балота ў Еўропе, Сібір у Беларусі]. **Б**. гідралагічны заказнік “Балота-Мох” (1981) 4,84 тыс га. меры аховы ідэнтычны заказніку “Ельня”. **В**. батанічны заказнік рэспубліканскага значэння “Чыстая дубрава” ў Язненскім лясніцтве (1963), дубы ўзростам 200 гадоў. Захаваліся паркі, ці іх рэшткі ў в. Лявонпаль, Каменполле, Дзедзіна, а таксама “Паўвостраў” у Мёрах. У раёне 96 азёр, 16 азёр, 39 ручаёў. Самы вялікі камень – Язненскі талеркавы камень (6,26–5,1–1,2 м), вага 141 тона. Знаходзіцца ў в. Язна. На камяні былі выявы талеркі, кубкаў, відэльцаў.

**<u>Пастаўскі раён</u>**

1. **Паставы** (палац Тызенгаўзаў (1760); архітэктурны ансамбль Рыначнай плошчы (1760–1780: дом рамеснікаў, аптэка, аўстэрыя і інш.); будынак былога вадзянога млына (сяр. XIX ст.); касцёл Антонія Падуанскага (1880–1887, арх. Гойбель, неагатычны стыль); Свята-Мікалаеўская царква (1894, псеўдарускі); помнік К. Тызенгаўзу; краязнаўчы фенамен: калі Ушаччына – раён паэтаў, то Пастаўшчына – краязнаўцаў; сталоўка “СССР”)
2. **Агароднікі** (радзіма бел. паэта Ул. Дубоўкі: “О Беларусь, мая шыпшына!”)
3. **Апідамы** (царква Успення, стараверская, драўляная, знаходзіцца ў памежнай зоне)
4. **Асінгарадок** (Пакроўская царква (пач. XX ст., драўляная, “мадэрн”); гарадзішча “Гарадок”)
5. **Варапаева** (былы вадзяны млын; фрагменты парка (пач. XX ст.)
6. **Дунілавічы** (Траецкі касцёл (1769–1773, пераход ад барока да класіцызма)
7. **Жакі** (помнік удзельнікам паўстання 1830–1831 гг. (2000), на месцы знішчанага ў савецкія гады), знаходзіцца ў памежнай зоне)
8. **Лынтупы** (касцёл Св. Андрэя Баболі (1914); сядзібна-паркавы комплекс: сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы, парк, бутавы мост, сажалкі, капліца; валуны – помнікі прыроды. Месца жыхарства выдатнага краязнаўцы А. Гарбуля; аграсядзіба каваля Ю. Фурса)
9. **Казлоўшчына** (капліца-пахавальня Друцкіх-Любецкіх (1843) і рэшткі гаспадарчых пабудоў; вадзяны млын (1859); мемарыяльны камень у гонар 1900-годдзя хрысціянства)
10. **Камаі** (каменны крыж з трохкутнай нішай для распяцця (XVI ст); касцёл Іаана Хрысціцеля (1606, абарончы стыль); дэкаратыўнае аздабленне інтэр’ера касцёла: роспісы скляпенняў, алтары, арган, хоры (1603–1606, XVIII–XIX); месца служэння дзеяча беларускага нацыянальнага руху,

Репозиторий ВГУ

святара Казіміра Сваяка; мемарыяльная шыльда ў гонар А. Ромера, вядомага беларускага мастака; будынак былога паравога млына; яўрэйскія могілкі)

11. **Каралінова** (будынак былой сядзібы вядомага жывапісца Альфрэда Ромера, драўляная)

12. **Крыкалы** (сядзіба Абрамовічаў: рэшткі флігеляў, вадзянога млына, парка, арачнага мастка)

13. **Кукляны** (стараверская Успенская царква (1-я пал. XIX ст. драўляная, знаходзіцца ў памежнай зоне)

14. **Курсевічы** (пускавыя шахты ядзерных ракет былой ваеннай базы)

15. **Ласіца** (Пакроўская царква (1830)

16. **Лучай** (касцёл Юды Тадэвуша (1766, як езуіцкі, ў 1-й палове XIX ст. перабудаваны, барока, класіцызм); роспісы ў інтэр'еры касцёла)

17. **Манькавічы** (Успенская царква (1871); рэшткі парка; будынак былога вадзянога млына; рэшткі капліцы Друцкіх-Любецкіх)

18. **Мягуны** (каталіцкая капліца; брама, агароджа)

19. **Норыца** (рэшткі парка (2-я пал. XVIII ст.); бровар)

20. **Парыж** (назва вёскі – помнік духоўнай культуры краіны, металічная вежа)

21. **Пераслега** (леснічоўка, 1920–1930)

22. **Раманішкі** (сядзібны дом, драўляны; афіцына; прыдарожная капліца; рэшткі парка; у памежнай зоне)

23. **Рымкі** (Дабравешчанская царква (1880); ветраны млын з вертыкальным размяшчэннем крылаў (1990)

24. "**Салаўіная рошча**" (агра-экатурыстычны комплекс: страўсы, фазаны, алені, казулі, дзікі, свінні, экалагічная кухня, экзатычныя стравы)

25. **Саранчаны** (камяні з высечанымі крыжамі)

26. **Свірдуны** (помнік салдатам Першай сусветнай вайны)

27. **Стукаўшчына** (язычніцкі комплекс, капішча)

28. **Трабуцішкі** (рэшткі вадзянога млына)

## <u>Докшыцкі раён</u>

1. **Докшыцы** (Пакроўская царква (1903, псеўдарускі); будынак былога млына; выток ракі Бярэзіна; яўрэйскія; татарскія могілкі; могілкі польскіх жаўнераў)

2. **Асінавік** (каменны крыж "Каралёў Стан")

3. **Бабцы** (каменныя крыжы, больш за 26 шт ад 0,3 да 2 м)

4. **Бірулі** (капліца-пахавальная Юзэфовіча (1900); гарадзішча Шведава гара. Самае высокае месца ў наваколлі – 183 м)

5. **Бягомль** (помнік вызваліцелям; помнік ахвярам фашызма; партызанскі аэрадром; самалёт Лі-2 (Ан-4); царква Усіх Святых (др. пал. XIX ст.); будынкі былога бровару (1870-я гг.)

6. **Бярозаўка** (былы бровар)

Репозиторий ВГУ

7. **Берaснёўка** (каменныя гаспадарчыя пабудовы, пач. XX ст.)
8. **Бярэзінскі запаведнік**
9. **Ваўкалата** (касцёл Іаана Хрысціцеля (1893); бакавыя алтары ў касцёле (XVIII ст.)
10. **Вешкі** (радзіма кампазітара Н.Ф. Сакалоўскага (1902–1950), аўтара музыкі Дзяржаўнага гімна БССР, “Песня пра Нёман” (на словы А. Астрэйкі).
11. **Гняздзілава** (капліца-усыпальніца (драўляная); гаспадарчыя пабудовы былой сядзібы)
12. **Кіякова** (капліца-пахавальня Кіяковых на могілках, гаспадарчыя будынкі сядзібы: стайня, амбар)
13. **Новая вёска** (мемарыял у памяць пра італьянскіх салдат і савецкіх мірных грамадзян, загубленых у гады Вялікай Айчыннай вайны)
14. **Параф’янава** (Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі (1908, псеўдабарока); бровар; чыгуначная станцыя, казарма; лядоўня; грамадзянская забудова)
15. **Парэчча** (магіла Генрыка Дмахоўскага, удзельніка паўстання 1863 г., камісара Дзісненскага павета, скульптара)
16. **Порплішча** (Спаса-Праабражэнская царква (1627, драўляная); алтары-кіоты царквы (1627, 1794))
17. **Сітцы** (фрагменты парку і сядзібы Бжаздоўскіх (пач. XVIII ст., барока; Свята-Георгіеўская царква (пач. XX ст.)
18. **Сцёп-камень**
19. **Таргуны** (Спаская царква (1-я пал. XX ст.); радзіма пісьменніцы Леанілы Чарняўскай, жонкі М. Гарэцкага)
20. **Тумілавічы** (царква Св. Георгія (1870-я гг., дрэва); брама; званіца; каменны крыж; на месцы панскага маёнтка Антаполь расце дуб-волат (узрост 300 гадоў, вышыня 28 м, абхват 4,53 м); ва ўрочышчы Дабруньскі грыбёл расце самая вялікая хвоя ў раёне (вышыня 29 м);
21. **Чарнічка** 1-я (дуб-волат узростам 400 г.)
22. **Шунеўка** (мемарыяльны комплекс “Праклён фашызму” (“сястра” Хатыні, спалена разам з жыхарамі 22.05. 1943 г.)

Славутыя землякі: беларускі паэт **Алесь Ставер** (1929–1995); дзеяч бел. нац. руху Кастусь **Акула** (сапр. прозвішча А.І. Качан (1925–2008)

## <u>Шаркаўшчынскі раён</u>

1. **Шаркаўшчына** (былы сядзібны дом (пач. XX ст., неакласіцызм); Успенская царква (1912, мадэрн); царква іконы “Усіх смуткуючых Радасць” (кан. XIX ст.); сядзібны дом сядзібы Федаровічаў; будынак былога вадзянога млына; гаспадарчыя пабудовы сядзібы Лапацінскіх)
2. **Малыя Алашкі** (месца жыцця і дзейнасці вядомага беларускага селекцыянера І.П. Сікоры і комплекс аб’ектаў, звязаных з ім (1930-я гг.)
3. **Варонка** (Прачысценская стараверская царква (пач. XX ст., помнік



Репозиторий ВГУ

драўлянага дойлідства)

4. **Германавічы** (комплекс былой сядзібы: сядзібны дом, рэшткі гаспадарчых пабудоў, парк (1782); Праабражэнскі касцёл (1787); Прачысценская стараверская царква (пач. XX ст., помнік драўлянага дойлідства); культурна-асветніцкі цэнтр Я. Драздовіча і прыватная галерэя імя Міхася Райчонка; могілкі польскіх жаўнераў; магіла маці Я. Драздовіча)

5. **Дзіўная** (гарадзішча "Гарадзец"; капліца (к. XVIII ст., прыклад архітэктуры малых форм); сядзіба Плятараў, парк (мяжа XVIII–XIX стст.)

6. **Лазовікі** (каталіцкая капліца Даравання Дзевы Марыі (XIX ст., драўляная)

7. **Лужкі** (комплекс былой сядзібы: палац, капліца, гаспадарчыя пабудовы, уязная брама, парк (XVIII–XIX ст.); Міхайлаўскі касцёл (1744–1756, позняе барока); царква Раства Багародзіцы (1794, пераход ад барока да класіцызму); былы вадзяны млын (XIX – пачатак XX ст.); аддзел Германавіцкага музею культуры і побыту; артылерыйская гармата часоў Першай сусветнай вайны на воінскіх могілках)

8. **Шкунцікі** (Ільінская царква (1825, класічны), перароблeная з касцёла)

<u>Славутыя землякі</u>: Ст. Булак-Балаховіч (Лужкі – працаваў), А. Грын, Я. Драздовіч, М. Машара

<u>Фестывалі</u>: "Фестываль малых рэк", "Светлы яблычны Спас – Сікорскай душы часцінка"

## <u>Віцебскі раён</u>

1. **Акцябрская** (забудова цэнтральнай сядзібы былога саўгаса "Сялюты" імя 50-годдзя СССР; гісторыка-краязнаўчы музей Віцебскага раёна; музей баявой і працоўнай славы ў Акцябрскай СШ; Дом рамёстваў)

2. **Арлова** (брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан. Пахавана больш за 12 тыс. Чалавек, сярод іх 2 Героі Савецкага Саюза: Г.С. Грыгор'еў, П.В. Шысцяроў; помнік у гонар 1-й штурмавой камсамольскай брыгады, якая ў 1944 г. удзельнічала ў вызваленні Віцебшчыны)

3. **Астраўскія** (брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму (пахаваны больш за 200 чалавек); памятны знак у гонар месца базіравання штаба 1-й Беларускай партызанскай брыгады (чэрвень–кастрычнік 1943 г., камандзір М.П. Шмыроў); востраў сярод Дзвіны; назіральная вышка Рубаўскага лясніцтва)

4. **Бабінічы** (брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан (пахаваны больш за 2,5 тысячы чалавек); мемарыяльная дошка ў гонар 100-годдзя школы; мемарыяльная шыльда ў памяць візіта М.І. Калініна; мемарыяльная шыльда ў гонар настаўнікаў і вучняў школы)

5. **Бараўляны** (курганная група IX–XI стст. н.э.; "Чортаў мост"; комплекс былой паштовая станцыі ўзору 1843 г.)

6. **Баронікі** (гарадзішча ранняга жалезнага веку; нямецкія ДОТы; башня танка Т-70; памятны знак на месцы канцлагера для камандзіраў Чырвонай Арміі; р. Лучоса)

Репозиторий ВГУ

7. **Бібіраўка** (хвоя “Ведзьміны пальцы”/“Чортава лапа” – адна з самых вялікіх на Беларусі (l=525 см, r=83 см.); Мядзвежыя горы – месцы масавых гулянняў гараджан да вайны; крыніца; вялікі камень Бібіраўскі ў Дзвіне)

8. **Брыгіптолле** (рэшткі парка; былая сядзіба (драўляная); каменная каса ў Дзвіне для рэгуляцыі цячэння вады ў рацэ)

9. **Вароны** (помнік на месцы бою 1812 г.; памятны крыж на месцы загубы ахвяраў сталінскіх рэпрэсій у 1933–1937 гг.; курганны могільнік каля воз. Палонскага; брацкая магіла воінаў Чырвонай Арміі (пахавана больш за 3,5 тысяч салдат); помнік “віцебскім панфілаўцам”; помнік савецкім лётчыкам 953-га штурмавога авіяпалка; гарадскі сметнік)

10. **Вымна** (радзіма выдатнага беларускага этнографа і краязнаўцы М.Я. Нікіфароўскага; месца Тадулінскага праваслаўнага манастыра; брацкія могілкі; помнік Герою Савецкага Саюза А.Е. Углоўскаму; гара “Змяівец” і паданне пра яе)

11. **Вялікія Лётцы** (былая сядзіба У.У. Адамава (вядомы геабатанік, фларыст, дэндролаг); месца жыцця і дзейнасці У.У. Адамава; рэшткі батанічнага сада)

12. **Вярхоўе** (памятная шыльда на месцы пахавання Я.В. Рэпіна – бацькі знакамітага мастака І.Я. Рэпіна; крыж на магіле генерал-маёра П.І. Жываглядава (1777–1857); месца, дзе знаходзілася царква; дубы-волаты; этнаграфічны куток у дзіцячым садку п. Вярхоўе; музей гісторыі краю у Вярхоўскай СШ (СШ № 15 г. Віцебска); помнік на месцы загубы мірных грамадзян фашыстамі ў 1942 г.; адпрацаваныя даламітавыя кар’еры; парог на Дзвіне; возера Каралева (Псярскае); чыгуначная станцыя Задзвінне; бройлерная птушкафабрыка “Ганна”; помнік тэхнічнай вытворчасці – здабыча даламіта і выпальванне вапны)

13. **Гараднянскі Мох** (брацкая магіла савецкіх воінаў (пахавана больш за 1,5 тыс. салдат, загінуўшых у 1944 г.); гарадзішча; торфараспрацоўкі)

14. **Герасімава** (помнік у гонар няўдалага наступлення (25.12.(31).12. 1943 г.)

15. **Грабяніца** (брацкая магіла партызан. Пахавана больш за 100 партызан 1-й Віцебскай брыгады, якія загінулі ў 1941–1943 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў); мемарыяльны знак і зямлянка на месцы збораў падпольшчыкаў (у 2 км. ад вёскі); дубы каля воз. Валконка; возера Валконка (Волкунь); паданне пра тое, што ў ім схаваны скарб Напалеона)

16. **Дарагакупава (Прыдзвінне)** (крыніца; валуны; вялізны клён; азёры Белае і Чорнае (легенда, магчымае месца капішча)

17. **Доўжа** (камень Кахання і легенда аб ім; востраў Кахання на воз. Сосна; сістэма азёр – Сосна, Цыганоўскае, Малае, Сярэдняе, Канавалаўскае; былая біяфабрыка імя Я.Р. Каваленкі; дэндрапарк і зона адпачынку пры мясцовым лясніцтве)

Репозиторий ВГУ

18. **Дрыколле** (гарадзішча “Царкавішча”; каменныя крыжы і пліты” (14 на гарадзішчы і старажытных могілках, пра якія згадвае А.П. Сапуноў)

19. **Дубрава** (Вымнянскі с\с) (не існуе, месца спаленай вёскі)

20. **Дымаўшчына** (арніталагічны заказнік “Дымаўшчына”)

21. **Зазыбы** (радзіма беларускага пісьменніка М. Лынькова, не існуе)

22. **Заронава** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (пахавана больш за 8 тыс. салдат і афіцэраў Чырвонай арміі); музей “Гісторыя Заронаўскага краю”; крыжы, якія растуць з зямлі; гарадзішча і паселішча)

23. **Заполле** (помнік “Віцебскія вароты”; брацкае пахаванне савецкіх салдат і партызан, гармата; месца базіравання штаба 1-й Беларускай партызанскай брыгады; радзіма М. Сільніцкага)

24. **Жалязнякі** (санаторый “Жалязнякі”)

25. **Каралёва** (месца жыцця і дзейнасці А.С. Бялыніцкага-Бірулі – першага метэаролага на Віцебшчыне (вёў рэгулярныя назіранні прыроды з 1855 г.); дубы-волаты; не існуе)

26. **Койтава** (урочышча “Здраўнева” – маёнтак І.Я. Рэпіна; дом-музей І.Я. Рэпіна; помнік І.Я. Рэпіну; памятны знак у гонар 825-га волга-татарскага батальёна “Ідэль-Урал”, які перайшоў на бок партызан у лютым 1943 г.; брацкая магіла савецкіх воінаў; крыніца)

27. **Кукавячына** (радзіма асветніка А. Рыпінскага; месца баёў у 1812 г.; радзіма П.Л. Грышчанкі (лётчык-знішчальнік, Герой Савецкага Саюза. Збіў 27 варожых самалётаў); аэрадром, месца правядзення спаборніцтваў па верталётным спорце, месца, дзе можна замовіць скачкі з парашутам, паглядзець самалёты і верталёты)

28. **Курына** (курганы, даследаванні якіх праводзіліся З. Даленга-Хадакоўскім; магіла Героя Савецкага Саюза М. Сільніцкага; Святая крыніца)

29. **Лётцы** (курортная зона “Лётцы”; санаторый “Лётцы”; мінеральныя крыніцы; аздараўленчыя летнікі; комплекс рэканструкцый пахавальных абрадаў)

30. **Лужасна** (гарадзішча і паселішча ў Цёплым лесе; будынак Земляробчай школы і адміністрацыі (1909, мадэрн); Пакроўская царква (1908, псеўдарускі стыль); будынак былой царквы Узвіжання крыжа (XVIII ст.); чыгуначная станцыя “Лужасна” (у 1940 г. быў зарэгістраваны мінімум тэмпературы на Беларусі: – 44 С°); Лужаснянскі дэндрапарк; помнік прыроды “Браты”: дуб і ясень растуць з аднаго кораня; каменныя крыжы (на могілках былой в. Слабодка (XIX в.); Лужаснянскі аграрны каледж; Музей гісторыі аграрнага каледжа; анатамічны музей; стадыён з рэзінабітумным пакрыццём (на 1200 месцаў); помнік на месцы згубы фашыстамі ваеннапалонных і савецкіх грамадзян у 1941–1942 гг.; помнік М. Сільніцкаму (першаму камсамольцу Беларусі, які стаў героем Савецкага Саюза ў гады Вялікай Айчыннай вайны); мемарыяльная дошка

Репозиторий ВГУ

на месцы бою 1.02. 1942 г.; помнік Ф.А. Сурганаву (у музеі каледжа); помнік У.І. Леніну; помнік І.В. Сталіну (у рэчцы Лужаснянцы)

31. **Лужкі** (месца базіравання штаба 1-й Віцебскай партызанскай брыгады)

32. **Лукі** (былая сядзіба А.А. Астрэйка (кан. XIX ст.); рэшткі гаспадарчых забудоў; месца дзейнасці прыватнай ткацкай школы ў пачатку XX ст.; затон; незвычайнае пашырэнне, гідратэхнічныя збудаванні на рацэ Дзвіна; анамальная зона (месца, дзе людзі губляюцца ў часе)

33. **Лушчыха** (месца, дзе планавалася будаваць Суражскую ГЭС)

34. **Лятохі** (курганны могільнік, 14 насыпаў і 1 доўгі курган)

35. **Мазалава** (сядзібны дом былога маёнтка "Мілае" І. Манькоўскага (1804, класічны стыль); рэшткі вадзянога млына; помнік землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны)

36. **Макарава** (месца прарыва савецкімі войскамі нямецкай абароны ў чэрвені 1944 г., у час наступальнай аперацыі "Баграціён")

37. **Мяклава** (гарадзішча (ва ўрочышчы Любашкова); поселішча; курганны могільнік; месца былой сядзібы царкоўнага дзеяча В. Лужынскага)

38. **Ноўка** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан; алея славутых землякоў; верталёт Мі-2, (у дзіцячым садку); лёгкаатлетычны манеж)

39. **Падбярэззе** (месца нараджэння Я.А. Храпавіцкага (1612–1685), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, віцебскага ваяводы, дыпламата; гаспадарчыя будынкі сядзібы памешчыка Магучага; ясень, які зросся з елкай; агромныя яры са стромкімі схіламі і ўчастак берага Дзвіны, які парос лісцвеным лесам)

40. **Пуцявішча** (месца дзеяння паэмы "Тарас на Парнасе", не існуе)

41. **Руба** (даламітавы кар'ер "Гралёва" – другі па велічыні ў Еўропе; адбіткі ў даламіце істот, якія пражывалі ў верхнедэвонскім перыядзе; насыпныя горы – пляцоўка агляду, месца адпачынку лыжнікаў; адпрацаваныя кар'еры, напоўненыя вадой – месцы з унікальнай расліннасцю і вельмі маляўнічым ландшафтам; вытворчае аб'яднанне "Даламіт"; Вярхоўскі парог – самы складаны і небяспечны парог на р. Дзвіна; адзінае месца вырастання ў Беларусі вадзяного імха – Цынклідотуса Дунайскага; дэндрапарк Рубаўскага лясніцтва; Храм Святога вялікамучаніка і цаліцеля Панцеляймона)

42. **Рыбакі** (самая вялікая ліпа ў раёне)

43. **Сакольнікі** (курганны могільнік ва ўрочышчы "Кахоўка", мясцовая назва "Французскія могілкі"; памятны знак на месцы маёнтка выдатнага беларускага гісторыка і краязнаўцы А.П. Сапунова ва ўрочышчы "Кахоўка"; месцы вырастання шпажніка чарапіцавага; цікавы гідралагічны і адметны экалагічны аб'ект "Бруяк" (выспы і камяні)

44. **Сасноўка** (возера Гараднянскае і зона адпачынку; рэшткі панскага парка: ясеневая алея; санаторый для хворых на сухоты, будынкі санаторыя – помнік архітэктуры 1920-х гг.; дуб-волат (радыус 0,85 м, 400 гадоў); месца

Рэпазіторый ВДУ

знаходжання штаба 3-й танкавай арміі нямецкіх войскаў у 1942–1943 гг.; нямецкія воінскія могілкі, разбураны)

45. **Саўчонкі** (жалезабетонны ДАК (доўгачасовая агнявая кропка) на чыгуначнай станцыі Лосвіда; палігон мабільных сіл "Лосвіда"; сістэма азёрак (Ліпкі, Талерка, Шэсценскае і інш.), якія па легендзе звязаны паміж сабой падземнымі праходамі-тунэлямі; легенда пра подводную пачвару, што жыве ў азёрках; аздараўленчы лагер "Ліпкі")

46. **Светлы** (вадасховішча; рэшткі былога цаглянага завода)

47. **Старае Сяло** (гісторыка-краязнаўчы музей у СШ "народны" (1994); помнік савецкім салдатам, загінуўшым у 1941–1944 гг., (пахаваны больш за 2,5 тыс савецкіх салдат); помнікі Героям Савецкага Саюза У.П. Краеву і Ф.П. Ерзікаву; гарадзішча ранняга жалезнага века на беразе Дзвіны (вельмі маляўнічае месца); каменны крыж з магілы генерала ад кавалерыі У.І. Андрыянава (знаходзіцца каля мясцовай СШ); дуб-волат; памятны знак на месцы, дзе была Свята-Уваскрасенская царква; радзіма самага вялікага чалавека ў свеце – Фёдара Махнова (рост 285 см); радзіма мастака Уладзіміра Лускіны (1849–?), вучня Яна Матэйкі)

48. **Суднікі** (радзіма грамадскага і дзяржаўнага дзеяча БССР Ф.А. Сурганава; каменныя крыжы; вялізныя хвоі на могілках; Святая крыніца; "Змяёў вал" – геалагічны помнік прыроды часоў апошняга абледзянення; воўчы пераход; "Ташнік" – падане пра балота; асфальтавы завод)

49. **Сураж** (замчышча; помнік дзецям Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова; паромная пераправа; музей Міная Шмырова ў сярэдняй школе; месца на шляху "з вараг у грэкі"; памятны знак на месца разгрому варожага гарнізону ў 1942 г.; памятны дуб; геалагічны помнік прыроды "Суражскія агаленні")

50. **Сушчова** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (пахаваны каля 1 тыс. воінаў); месцы былых латышскіх хутароў; самая вялікая хвоя на Беларусі (радыус дрэва 142 см); месца дзейнасці партызанскіх атрадаў і брыгад; дуб-волат)

51. **Трыгубцы (**рэшткі вадзяного млына каля былой в. Шкялі; унікальны парог на р. Лужаснянка; пясчаны кар'ер "Шалыгі")

52. **Тулава** (вадасховішча, зона адпачынку; помнік на месцы расстрэлаў яўрэяў з Віцебскага гета (Ілаўскі роў); радзіма Г. Марцінкевіча (паэт, празаік, драматург); батанічны заказнік "Тулаўскі"; месца правядзення мотакросаў; НДІ НАН Беларусі і эксперэментальная станцыя; былая сядзіба К. Гібенталя; прыватны заапарк А. Шаўчэнкі)

53. **Уланавічы** (могілкі, некропаль; "Чорныя пруды", месца загубы фашыстамі мірных жыхароў у 1941–1944 гг.)

54. **Хайсы** (птушкафабрыка; месца загубы мірных грамадзян 1937 – 1942 гг.; помнік У.І. Леніну)

55. **Хатоля** (курганы могільнік (3 курганы, дыяметрам 25–30 м курган

Репозиторий ВГУ

“Французская магіла”)

56. **Храпавічы** (месцы былых латышскіх хутароў; помнік Званкову на мясцовых могілках; падмуркі царквы)

57. **Цяцёркі** (садавіна-гароднінны пітомнік; вялізныя хвоі на могілках; крыніца; азёркі, пра якія існуе паданне, што ў іх жыве чорт)

58. **Чырвоны Двор** (месца сядзібы генерала У.П. фон Віттарфа; рэшткі парка; возера і зона адпачынку)

59. **Шапуры** (гарадзішча і селішча)

60. **Шульцава** (вышыня 222,9 м – месца, адкуль пачалося вызваленне г. Віцебска)

61. **Шэвіна (**“Лысая гара” – старажытнае гарадзішча, месца правядзення турзлётаў, фэстаў, імпрэз байкераў; р. Шэвінка; батанічны заказнік “Прыдзвінне” (пойменная дубрава)

62. **Якуціна** (рэшткі парка, дубовая алея (больш за 15 дубоў маюць вялікія памеры, узрост 150–200 гадоў); месца былой сядзібы вядомага рускага фізіёлага С.І. Чыр’ева (кан. XIX–пач. XX ст.), у якой у гады вайны існаваў дзіцячы дом; санаторый-прафілакторый “Лясная казка”; рака Дзвіна, рэшткі гідратэхнічных збудаванняў)

63. **Янавічы** (радзіма савецкага партыйнага і палітычнага дзеяча Савецкай Расіі, М.М. Барадзіна (Грузенберга), які адыграў важную ролю ў падзеях гісторыі Кітая ў 1920-я гады)

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

**ПІВАВАР** Мікалай Васільевіч

**ТУРЫСТЫЧНАЕ РЭГІЁНАЗНАЎСТВА**

Метадычныя рэкамендацыі


Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Камп'ютарны дызайн *Т.Я. Сафранкова*

Падпісана ў друк 18.04.2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 3,25. Ул.-выд. арк. 3,00. Тыраж 40 экз. Заказ 52.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.


Репозиторий ВГУ